№№151–152
(3488–3489)
4 кастрычніка 2011 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

www.nv-online.info

# Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог*
*Выхадзі, мой народ, грамадою...*

*Якуб КОЛАС*

**Да ўвагі!**
*Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!*

ЧУЛІ?

# Еўропа прапануе Лукашэнку зрабіць тры крокі за 9 мільярдаў долараў



Канцлер Германіі Ангела Меркель замест запланаваных 25 хвілін размаўляла з прадстаўнікамі беларускай апазіцыі паўтары гадзіны. *"Я жанчына практычная і ўсе пытанні абмяркоўваю канкрэтна"*, — сказала Меркель. І пацікавілася, што канкрэтна Еўропа можа зрабіць у беларускай сітуацыі. Прапанаваныя тры канкрэтныя крокі спадарыня Меркель энергічна падтрымала. Як, дарэчы, і амаль усе лідары краін Еўрасаюза.

## Дэмарш

З-за наяўнасці ў Беларусі палітвязняў Еўропа нават не разглядала магчымасці ўдзелу беларускага кіраўніка ў варшаўскай сустрэчы лідараў Еўрасаюза і краін праграмы "Усходняе партнёрства". Але гэта не азначае, што пасля прэзідэнцкіх выбараў беларусаў выкрасляць з сям'і еўрапейскіх народаў: запрашэнне было даслана міністру замежных спраў Сяргею Мартынаву. Але Мінск пайшоў на дэмарш. Спачатку было аб'яўлена, што міністр у Варшаву не едзе, а беларускую дэлегацыю будзе ўзначальваць беларускі пасол у Польшчы Віктар Гайсёнак. А потым і ўвогуле Беларусь адмовілася ад удзелу ў мерапрыемстве. Пакрыўдзіліся...

*"Арганізатары саміту "Усходняга партнёрства" зрабілі ўдзел беларускай дэлегацыі ў ім немагчымым",* — такую заяву агучыў прадстаўнік беларускага МЗС Андрэй Савіных. Згодна з заявай знешнепалітычнага ведамства нашай краіны, напярэдадні саміту *"яго арганізатары пайшлі на беспрэцэдэнтныя дыскрымінацыйныя меры ў дачыненні да Беларусі. Яны адмовіліся накіраваць запрашэнне кіраўніку беларускай дзяржавы. Услед за гэтым прызначаны Рэспублікай Беларусь кіраўнік яе дэлегацыі быў абмежаваны ва ўдзеле ў мерапрыемствах саміту"*...

Насамрэч "абмежавалі" Віктара Гайсёнка толькі ў адным: ён не быў запрошаны на вячэру кіраўнікоў дэлегацый. Арганізатары мерапрыемства палічылі ранг кіраўніка беларускай дэлегацыі (нават не міністра, а проста пасла) занадта нізкім, каб ён браў удзел ва ўрачыстай вячэры з лідарамі 32 еўрапейскіх краін. Так прынята ў сусветнай дыпламатычнай практыцы: абы-хто не можа сядзець за адным сталом з прэзідэнтамі. Але падобна на тое, што Мінску была патрэбна толькі нагода, каб ляпнуць дзвярыма.

## Пустое месца

Месцы афіцыйнай беларускай дэлегацыі на Варшаўскім саміце пуставалі ў прамым сэнсе слова. Еўрапейскія тэлеканалы замест беларускіх прадстаўнікоў паказвалі пустыя крэслы — нібыта нагадвалі, што такая краіна ёсць, але яна пакуль яшчэ не знайшла свой шлях у Еўропу.

*"Мы сёння не ў поўным складзе, бо, нягледзячы на запрашэнне, у сённяшніх нарадах не бярэ ўдзелу Беларусь — адна з краін "Усходняга партнёрства". Гэта яшчэ адзін моцны сігнал аб тым, наколькі важныя для Еўропы і Беларусі перамены, якіх мы ўсе чакаем",* — заявіў на пачатку пасяджэння прэм'ер-міністр Польшчы Дональд Туск.

Так ці іначай, але менавіта беларускае пытанне стала адной з галоўных тэм мерапрыемства. І калі афіцыйная беларуская дэлегацыя ні з кім не сустрэлася і ні ў чым не паўдзельнічала, то прадстаўнікі беларускай апазіцыі мелі перамовы на самым высокім узроўні. Як ніколі высокім!

Па выніках гэтах перамоў і стала вядома аб тым, што прапанавана так званая "трохкрокавая стратэгія". Для таго каб атрымаць беспрэцэдэнтную эканамічную падтрымку ад Еўропы, афіцыйнаму Мінску прапанавана зрабіць усяго тры крокі. **Па-першае, вызваліць і рэабілітаваць палітвязняў. Па-другое, распачаць палітычны дыялог з апазіцыяй. І трэці крок — правядзенне выбараў у адпаведнасці са стандартамі АБСЕ.** (Напэўна, маюцца на ўвазе выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, якія маюць адбыцца ў наступным годзе.)

Тры абавязковыя ўмовы, якія хаця б вяртаюць Беларусь у поле нейкай цывілізаванасці. І тады Беларусь атрымае "пакет дапамогі", які ацэньваецца ў 9 мільярдаў долараў. Бліжэйшым часам краіны Еўрасаюза сфармулююць прапанову больш канкрэтна. Але вядома, што гаворка ідзе пра гранты і крэдыты (у тым ліку ад МВФ і Еўрапейскага інвестыцыйнага банка), інвестыцыі, да таго ж акрамя эканамічных пытанняў у пакеце — змякчэнне для беларусаў візавага рэжыму з еўрапейскімі краінамі.

Чакаецца, што ўжо ў сярэдзіне лістапада еўракамісар па пытаннях расшырэння і палітыцы добрасуседства Штэфан Фюле прывязе канкрэтызаваны пакет прапаноў у Мінск. Але ў Варшаве было заяўлена адназначна, што без трох абавязковых крокаў Мінск не можа разлічваць ні на грашовую дапамогу, ні на паляпшэнне адносін з Еўропай. Так, старшыня Савета Еўропы Херман ван Рампей на выніковай прэс-канферэнцыі падсумаваў: "*У выпадку Беларусі Еўрасаюз не мяняе свайго бачання яе краінай дэмакратычнай, Беларуссю, якая зойме сваё годнае месца ў рамках еўрапейскага супрацоўніцтва. Але мы не ў стане зрабіць гэта супрацоўніцтва, пакуль не з'явяцца відавочныя прыкметы дэмакратызацыі і выканання правоў чалавека. Гэта азначае тэрміновае вызваленне і рэабілітацыю ўсіх палітычных зняволеных, а таксама пачатак перамоў з палітычнай апазіцыяй".*

## Усе — наперад, мы — назад

На Варшаўскім саміце афіцыйную Беларусь, якая сама сябе ізалявала, вельмі старанна абаранялі прэзідэнты былых савецкіх рэспублік. Аляксандр Лукашэнка нават асабліва падзякаваў за гэта Міхаілу Саакашвілі, Віктару Януковічу, Ільхаму Аліеву. Але самі гэтыя краіны актыўна рвуцца ў Еўропу і да грошай, якія выдзяляюцца краінам — партнёрам ЕС. Так, да канца бягучага года будзе падпісана пагадненне паміж Украінай і Еўрасаюзам аб партнёрстве, пачнуцца таксама перамовы з Малдовай і Грузіяй аб паглыбленні эканамічнага супрацоўніцтва. Суседзі разумеюць, што іншага шляху развіцця няма, што арыентацыя толькі на Расію небяспечная і непрадказальная. Але Аляксандр Лукашэнка ўпарта робіць выгляд, што пра гэтыя тэндэнцыі не ведае. І што ён патрэбны Еўропе болей, чым Еўропа патрэбна Беларусі. Лідары краін ЕС адназначна далі паняць, што гэта не так. Яны гатовы дапамагаць толькі цывілізаванай, прыстойнай Беларусі. Але для гэтага мы павінны зрабіць тры важныя крокі ў будучыню.

**Ігар МАРОЗАЎ.**

### ТЫМ ЧАСАМ...

Беларусь захавае свой удзел у праграме "Усходняе партнёрства", аднак разлічвае, што ў далейшым гэтая праграма будзе напоўнена канкрэтнымі праектамі. Такую заяву ў панядзелак зрабіў міністр замежных спраў **Сяргей Мартынаў**.

*"Мы не прынялі ўдзел у саміце, але ўдзел ва "Усходнім партнёрстве" мы захаваем",* — сказаў кіраўнік знешнепалітычнага ведамства.

## *Будзем прасіць у МВФ 7 мільярдаў долараў...*

Сёння ў Мінск прыязджае місія МВФ.

Беларусь разлічвае прыцягнуць да 7 мільярдаў долараў ЗША крэдыту ад МВФ, паведаміў журналістам намеснік міністра фінансаў **Уладзімір Амарын**.

Паводле яго слоў, з 4 па 17 кастрычніка ў краіне будзе працаваць місія МВФ на чале з кіраўніком місіі МВФ у Беларусі Крысам Джарвісам, якая павінна ацаніць сітуацыю ў нашай краіне.

*"Пакуль гэта будзе ацэнка, але, магчыма, перамовы пяройдуць у фазу разгляду*, — цытуе Амарына БелаПАН. — *Гэта будзе новая праграма рэформ, паводле ацэнкі МВФ, досыць цвёрдая, можа, нават больш жорсткая, чым з Антыкрызісным фондам ЕўрАзЭС, якую мы цяпер выконваем".*

Ён таксама ўдакладніў, што да канца кастрычніка ў Беларусь павінен паступіць чарговы транш крэдыту з Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС у 440 мільёнаў долараў.

## *...у Ірана — 400 мільёнаў*

Учора, выступаючы ў Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу, старшыня праўлення Нацыянальнага банка **Надзея Ермакова** паведаміла, што Беларусь мае намер прыцягнуць крэдыты Ірана ў суме 400 мільёнаў долараў. Апроч таго, прынята рашэнне ўзяць 1 мільярд пад забеспячэнне акцый "Нафтана".

### МІЖ ІНШЫМ

## *Пазыка расце*

Дзяржаўны доўг Беларусі на 1 верасня 2011 года склаў 75 трлн 340,9 млрд рублёў, што на 6,7 працэнта больш, чым было на 1 жніўня. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве фінансаў.

Унутраны дзярждоўг дасягнуў 13 трлн 988,4 млрд рублёў (рост на 9,6 працэнта за жнівень). Знешні доўг у эквіваленце нацыянальнай валюты склаў 61 трлн 352,5 млрд рублёў (рост на 6 працэнтаў за жнівень).

## *Някляеву прыгразілі турмой*

*Экс-кандыдат у прэзідэнты атрымаў афіцыйнае папярэджанне ў крымінальна-выканаўчай інспекцыі Ленінскага раёна Мінска.*

Справа ў тым, што на мінулым тыдні палітык выязджаў у Варшаву на саміт "Усходняга партнёрства". Тым часам на пачатку верасня суд забараніў яму пакідаць межы краіны і нават выязджаць са сталіцы. Праваахоўнікі папрасілі Някляева патлумачыць свае паводзіны.

— *Я ім прынёс сваю паперу, а яны мне далі сваю*, — расказаў Някляеў журналістам. — *Мы, так сказаць, згулялі папера на паперу. У іхняй было папярэджанне афіцыйнае, што калі я буду сабе дазваляць не выконваць пастанову суда, то яны будуць хадайнічаць у той самы суд, каб ён адмяніў гэтую адтэрміноўку і зрабіў турэмнае зняволенне рэальным*.

## *Апошняе папярэджанне атрымала і Наста Палажанка*

*Яна толькі што адседзела 11 сутак па абвінавачванні ў парушэнні парадку арганізацыі і правядзення масавага мерапрыемства. Такое рашэнне прыняла суддзя Цэнтральнага раёна Мінска Наталля Вайцяховіч.*

3 кастрычніка Палажанку выклікалі ў Першамайскі РУУС Мінска і, узяўшы тлумачэнне, далі падпісаць паперу аб вынясенні дзяўчыне афіцыйнага папярэджання аб недапушчальнасці адміністрацыйных правапарушэнняў. У выпадку яшчэ аднаго прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці ўмоўны тэрмін дзяўчыны ператвараецца ў рэальны — год зняволення.

Нагадаем, 20 мая суддзя Фрунзенскага раёна Мінска Жанна Жукоўская абвясціла прысуд Уладзіміру Някляеву — 2 гады пазбаўлення волі з адтэрміноўкай на 2 гады, Сяргею Вазняку, Аляксандру Фядуце, Віталю Рымашэўскаму, Андрэю Дзмітрыеву — па 2 гады ўмоўна, Настассі Палажанцы — 1 год умоўна.

ЭКСКЛЮЗІЎ

*Дзмітрый УСС:*

# «Мужчына павінен заставацца мужчынам...»




У суботу на волю быў адпушчаны экс-кандыдат на пасаду прэзідэнта **Дзмітрый Усс**.

Яму далі падпісаць паперу аб тым, што ён азнаёміўся з загадам аб вызваленні, і вывелі за браму Мінскага СІЗА. Былы палітвязень пайшоў дадому, які знаходзіцца па іроніі лёсу ў суседнім з Адміністрацыяй Аляксандра Лукашэнкі будынку.

Дзмітрыя Усса пакаралі зняволеннем на пяць з паловай гадоў за Плошчу. Ён быў сярод тых кандыдатаў на пасаду прэзідэнта, якія не былі 19 снежня на плошчы Незалежнасці. Ён не пагадзіўся падпісаць паперу з асуджэннем дзеянняў іншых кандыдатаў, удзельнікаў акцыі і адмовіўся ад супрацоўніцтва са спецслужбамі. Так атрымалася, што імя гэтага чалавека падчас прэзідэнцкай выбарчай кампаніі практычна не гучала. Загаварылі пра Дзмітрыя Усса падчас суда і пасля абвяшчэння прысуду. "Народная Воля" задала пытанні палітыку, які сваімі ўчынкамі выклікаў павагу.

— **Са свабодай!** — павіншавалі мы Дзмітрыя.

— Дзякуй казаць рана. Пакуль усе палітзняволеныя не выйшлі, казаць пра свабоду ў звычайным сэнсе гэтага слова не даводзіцца. Я не магу адчуваць сябе свабодным у такой сітуацыі.

**— Калі вы былі ў турме, думалі, чым будзеце займацца, калі выйдзеце на волю? Ці было адчуванне, што свабода не за гарамі?**

— Я якраз быў упэўнены, што прабуду там усе пяць гадоў. Але з боку ЗША і Еўрасаюза прагучалі вельмі суровыя ўмовы наконт вызвалення палітвязняў. Дзякуючы іх настойлівай пазіцыі, нас і пачалі адпускаць. Калі б яны больш лаяльна ставіліся да рэжыму Лукашэнкі, то я сядзеў бы ўсе пяць гадоў. Ніхто б мяне не вызваліў. Мы жывём у такім свеце, што такія рэчы не могуць прайсці непрыкметна. Уплыў міжнароднай супольнасці вельмі моцны.

**— Прашэнне аб памілаванні экс-кандыдат на пасаду прэзідэнта Дзмітрый Усс не пісаў. Як жа адбывалася працэдура вашага вызвалення?**

— Усё адбылося нечакана. Я быў у турэмным шпіталі, што ў мінскім СІЗА на Валадарскага. Мяне туды прывезлі этапам з Магілёва і сказалі, што трэба прайсці абследаванне для пацвярджэння групы інваліднасці. Рабілі там ультрагукавое абследаванне сэрца, бралі кроў на аналізы... Ну, як звычайна ў шпіталі. У суботу ўвечары падыходзіць кантралёр, дае мне спіс маіх рэчаў і кажа, каб я ўсё сабраў. Сказаў толькі, што мяне некуды пераводзяць. Усе пачалі цікавіцца, куды павязуць. Я думаў, што мяне перакідваюць у іншую калонію, бо ў той, дзе я быў, у мяне склаліся кепскія стасункі з адміністрацыяй. Мяне перавялі ў іншую камеру з рэчамі, нават рэмень мне аддалі, які забаронена мець у СІЗА. Потым прыйшоў нейкі чалавек у цывільным, прывёў мяне ў кабінет і зачытаў там загад аб тым, што прэзідэнт сваім указам мяне памілаваў. Я казаў, што не прасіў аб памілаванні, а мне адказалі, што прэзідэнт сам каго хоча можа памілаваць. Далі мне паставіць подпіс аб тым, што азнаёмлены, аддалі пашпарт і вывелі на вуліцу. Пайшоў дадому. Дома нікога не было. Сусед дазволіў мне патэлефанаваць жонцы. Яна была з дзецьмі ў вёсцы. Жэня прыехала... Адразу ж карэспандэнтаў цэлы натоўп...

**— Якія думкі наконт таго, што адпусцілі менавіта вас, а іншых пакуль трымаюць за кратамі?**

— Усіх павінны адпусціць. Мяне, магчыма, выпусцілі з-за таго, што я маю інваліднасць і былі вялікія праблемы з ціскам, які павышаўся да 190. Так што, можа, вырашылі не рызыкаваць.

**— Будзеце спачатку займацца сваім здароўем? Можа, абследаванне ў нейкай добрай клініцы?**

— Ды мяне абследавалі ўздоўж і ўпоперак... Станам здароўя буду займацца паралельна. Я спадзяюся перш за ўсё стаць дэпутатам Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ад сваёй акругі, дзе я раней быў дэпутатам.

**— Парадокс: калі былі мінулыя выбары, вы ж казалі, што выбараў у краіне няма...**

— Выбары будуць у наступным годзе. Еўрасаюз да таго ж настойвае, каб у Беларусі былі сапраўдныя дэмакратычныя выбары. Яны такія і будуць.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

ДЗІКУНСТВА!

# У Беларусі з'явіліся «эскадроны страху»?

***Адразу два па сутнасці бандыцкія напады адбыліся на беларускіх палітыкаў. Машыну намесніка старшыні партыі "Справядлівы свет" Валерыя Ухналёва абрабавалі невядомыя ў масках на трасе пад Валожынам, а лідар Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька пацярпеў ад нападу невядомых у цывільным побач з пад'ездам уласнага дома...***

## «Маўчы, інакш замаўчыш назаўсёды»

Ноччу 1 кастрычніка намеснік старшыні партыі "Справядлівы свет" Валерый Ухналёў вяртаўся з Вільнюса. Разам з палітыкам у машыне знаходзілася яго дачка Антаніна і сябра аргкамітэта па стварэнні "Беларускага руху" Вацлаў Арэшка.

Недалёка ад Валожына машыну Ухналёва спыніў чалавек, апрануты ў форму супрацоўніка ДПС. Загадаў выйсці і паказаць дакументы. А далей...

— *Раптам пад'ехалі дзве машыны, адкуль выскачылі невядомыя ў масках*, — распавёў падрабязнасці нападу Ухналёў. — *Яны паваліді мяне на зямлю, звязалі рукі дротам, адцягнулі метраў на 15 і кінулі ў кусты. Ніякіх слоў, ніякіх патрабаванняў з іх боку не было. Толькі адна каманда: "Маўчы, інакш замаўчыш назаўсёды!"*

З Вільнюса намеснік старшыні партыі "Справядлівы свет" вёз буйную суму грошай — 12 тысяч долараў. Грашовыя сродкі былі патрэбны Ухналёву для набыцця дарагіх лекаў для хворай на анкалогію жонкі. У Літве неабходных лекаў не было, таму палітык вёз іх назад. Разам з грашыма з машыны Ухналёва зніклі два ноўтбукі. Таксама невядомыя забралі ва ўсіх пасажыраў сумкі, барсеткі, мабільныя тэлефоны... Дакументы і ключы ад хаты палітыка нападнікі кінулі ў багажнік машыны...

Патэлефанаваць, каб паведаміць пра здарэнне, Валерый Ухналёў не мог. Толькі праз паўгадзіны ўдалося спыніць машыну, уладальнік якой даў свой тэлефон. Ухналёў паведаміў пра напад у міліцыю. На месца прыехалі супрацоўнікі Валожынскага РУУС: *"Да міліцыянераў, якія прыехалі па выкліку, у мяне прэтэнзій няма — спрацавалі яны прафесійна: апыталі, знялі адбіткі слядоў пратэктараў машын, на якіх прыехалі невядомыя ў масках...* — кажа Ухналёў. — *Асабіста для мяне відавочна: напад мае палітычную афарбоўку. Гэта акцыя запалохвання, каб чалавек сядзеў ціха і баяўся. Гэта бандытызм. Бандытызм на дзяржаўным узроўні. Калі машыну спыняе міліцыянер, а на цябе налятаюць людзі ў чорным у масках, такія ж, якія "працуюць" на пратэстных акцыях, я не думаю, што тут можа быць нешта іншае, акрамя дзеяння дзяржаўнага рэпрэсіўнага апарата".*

На думку Валерыя Ухналёва, расследаванне здарэння аб нападзе на ягоную машыну возьме на сябе УУС Мінскага аблвыканкама: "*Па-першае, нельга абвергнуць, што справа мае палітычны падтэкст,* — гаворыць палітык. — *Па-другое, вельмі важна высветліць, хто спыняў машыну — супрацоўнік ДПС ці чалавек, апрануты ў форму супрацоўніка ДПС..."*

Па словах Ухналёва, па факце здарэння будзе распачата крымінальная справа. Пра гэта яму паведамілі валожынскія міліцыянеры.

## «Адзіны саюзнік Лукашэнкі — гэта страх»

Гісторыя лідара Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзькі менш брутальная, хаця такая ж антызаконная.

1 кастрычніка Анатоль Уладзіміравіч вярнуўся ў Мінск з саміта "Усходняга партнёрства".

*"Мяне сустрэла жонка Святлана, і мы паехалі дамоў,* — расказвае Лябедзька. — *Каля пад'езда ўласнага дома я заўважыў траіх маладых людзей у цывільным. Я яшчэ пажартаваў: маўляў, вось госці да нас... Яны падышлі да машыны, запатрабавалі паехаць з імі. Я настойваў на тым, каб невядомыя назваліся і патлумачылі мэту свайго загаду. Але замест гэтага яны літаральна накінуліся на мяне... Завязалася патасоўка.*

*Не засталіся абыякавымі да таго, што адбываецца, мае суседзі. Адзін з іх нават заблакіраваў сваёй машынай выезд для мікрааўтобуса, на якім прыехалі невядомыя. Сталі разбірацца. Выклікалі міліцыю. Аказалася, што невядомыя ў цывільным — супрацоўнікі нейкай сілавой структуры. Але ў Цэнтральны РУУС Мінска я паехаў з тымі, хто быў апрануты ў форму. У пастарунку мяне абшукалі, відавочна, шукалі пашпарт, па якім я выязджаю за межы Беларусі. Не знайшлі. У пастарунку я паведаміў: "Ні слова без афіцыйнай позвы не скажу". Пасля гэтага мяне адпусцілі..."*

Інцыдэнт Лябедзькі звязвае са сваёй актыўнай палітычнай дзейнасцю. На прэс-канферэнцыі ён заявіў: *"У Беларусі шмат законных сілавых структур — МУС, КДБ і іншыя. Ёсць і незаконныя — гэта "эскадрон смерці". Зараз мы назіраем нешта новае — працуе "эскадрон страху". Яго мэта — запалохваць усіх, хто займае актыўную грамадзянскую пазіцыю: альбо не займайцеся палітыкай, альбо эмігрыруйце. Зараз сітуацыя такая: у Лукашэнкі не засталося саюзнікаў. Адзіны ягоны саюзнік — гэта страх, на які ён і разлічвае..."*

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**

ВІНШУЕМ!

# «Мару, каб кожны мой вучань знайшоў у жыцці свайго хрустальнага жураўля»

*Лепшым настаўнікам года стала выкладчыца англійскай мовы гімназіі г.Дзятлава Інэса Зубрыліна*

Яе Бог надзяліў усім: прыгажосцю, розумам, мудрасцю, талентам. Каб я была мастаком — напісала б яе партрэт, каб была паэтам — прысвяціла б самыя чароўныя радкі. Але, паколькі, як казаў Глеб Жыглоў у вядомым фільме, "не сподобил меня создатель" ні на тое, ні на другое, раскажу звычайнай прозай.



Гэта проста неверагодна, што мы з Інэсай Уладзіміраўнай Зубрылінай столькі гадоў у нашым маленькім гарадку Дзятлаве хадзілі па адных і тых жа вуліцах, бывалі на розных мерапрыемствах, але зусім не былі знаёмыя. І калі надоечы ўбачыла па тэлевізары, што настаўніца англійскай мовы з Дзятлаўскай гімназіі прызнана лепшым настаўнікам года Беларусі і ўзнагароджана хрустальным жураўлём, калі пачула яе кароценькае інтэрв'ю, шчыра парадавалася за сваю зямлячку.

Як толькі Інэса Уладзіміраўна вярнулася са сталіцы і крышку адпачыла, я напрасілася на сустрэчу. Сярэдняга росту, зграбная, нібы дзяўчына, з разумнымі добрымі вачыма, у якіх свеціцца прыязнасць і лагода.

Калі пачалі размаўляць, высветлілася, што я добра ведала яе дзядулю Дзмітрыя Ульянавіча і бабулю Яўгенію Іонаўну Новікавых. Абое працавалі настаўнікамі ў Дзятлаўскай сярэдняй школе №2, дзе цяпер якраз і месціцца гімназія. Бабуля выкладала гісторыю, а дзядуля і выкладаў, і быў завучам. На вялікі жаль, іх ужо няма ў жывых, але ў людской памяці засталася глыбокая павага і пашана за прыстойнасць, высокі прафесіяналізм, спагаду ў адносінах як да дзетак, так і да дарослых.

Тата Інэсы Уладзіміраўны, таксама гісторык, доўгі час працаваў у школе, а потым — у пашпартным стале ў міліцыі.

Мама была юрыстам, вельмі таленавітым, высакакласным спецыялістам. На вялікі жаль, яна рана пайшла з жыцця.

У радні Інэсы Зубрылінай вельмі шмат хто звязаў свой лёс з выхаваннем і навучаннем дзяцей.

Напрыклад, прадзед у свой час быў дырэктарам гімназіі ў Мсціславе, і ўсе яго чацвёра дзяцей таксама былі настаўнікамі. Ды і дзядзька Інэсы Уладзіміраўны Віктар Дзмітрыевіч Новікаў не так даўно быў выкладчыкам у Мінскім ваенным вучылішчы.

— Калі я была маленькая, бабуля ці дзядуля бралі з сабой у школу, бо дома не было з кім пакінуць. Садзілі на апошнюю парту і загадвалі сядзець ціхенька, слухаць уважліва, што кажуць вучні. Так на апошняй парце я і вырасла, — міла ўсміхаецца мая чароўная субяседніца.

— Усім вядома, што праца настаўніка нялёгкая. Яна аднімае шмат сіл і часу. Чым вы, так бы мовіць, расслабляецеся пасля заняткаў, якое ў вас хобі?

— О, у мяне шмат захапленняў! І найпершае — вельмі люблю падарожнічаць, даведвацца, як жывуць людзі ў іншых краінах, якія ў іх традыцыі, звычаі. Дасканалае валоданне англійскай мовай дае мне такую магчымасць.

— Шмат дзе пабывалі?

— Так. Я наведала Галандыю, Бельгію, Польшчу, Германію, Арабскія Эміраты. А свет жа такі вялікі, і ўсюды хочацца пабываць. Вярнуўшыся з падарожжа, я заўсёды расказваю сваім вучням аб усім, што бачыла і чула, дзялюся з імі ўражаннямі. Кажу: будзеце добра вучыцца, і вы зможаце там пабываць. Думаю, што гэта заахвочвае іх да старанных заняткаў англійскай мовай ды і іншымі прадметамі, падкрэсліваю, што ў сучасным свеце нельга быць неадукаваным чалавекам. І даўнейшая прымаўка "вучэнне — святло, а невучэнне - цемра" цяпер набыла яшчэ большае значэнне.

А яшчэ я вельмі люблю музыку. У свой час скончыла Дзятлаўскую музычную школу па класе раяля. Маю дома свой інструмент і часта іграю на ім. Асабліва калі самотна, а гэта, па-мойму, бывае ў кожнага чалавека, я саджуся за раяль, і чароўныя гукі музыкі, нібы крынічнай вадой, вымываюць з душы дрэнны настрой, і свет здаецца зусім інакшым: святлейшым і прыгажэйшым. Таму я вельмі ўдзячна тым людзям, якія дораць нам цудоўныя музычныя творы.

— Ледзь не забылася спытаць ці не пра самае галоўнае: у вас ёсць сям'я?

— Так. Муж і цудоўная дачушка Даша, якая ўжо вучыцца ў семым класе.

— Цяпер, калі я ведаю пра ваш радавод, здагадваюся, і дзе вы жывяце: гэта прыгожы ўтульны дом на вуліцы Савецкай, ля якога вельмі шмат кветак. Так?

— Правільна. Я вельмі люблю кветкі: і хатнія, і тыя, што растуць на двары. На жаль, не заўсёды хапае часу вырасціць усё, што хацелася б. І ўрокі, і я ж узначальваю прафсаюзную арганізацыю ў гімназіі. А гэта таксама справа няпростая.

— Інэса Уладзіміраўна, вы па тэлевізары сказалі, што вельмі ўдзячны за перамогу ў Рэспубліканскім конкурсе, за хрустальнага жураўля сваім вучням. Гэта было так кранаюча, калі настаўнік дзякуе вучням за свае поспехі...

— Так яно і ёсць. Яны мае жураўлікі. Я іх усіх вельмі люблю і так хачу, каб былі шчаслівыя і каб кожны знайшоў у жыцці свайго хрустальнага жураўля.

**Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.**

*Дзятлаўскі раён.*

## Дабавілі на паўкіло каўбасы?

У Беларусі з 1 кастрычніка павышана тарыфная стаўка першага разраду са 118 тысяч рублёў да 151 тысячы.

Канкрэтныя памеры названых даплат па тарыфных разрадах (з 1-га па 27-ы) у бліжэйшы час будуць устаноўлены пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, паведаміла міністр працы і сацыяльнай абароны Мар'яна Шчоткіна.

## Рэзервы Нацбанка ў крытычным стане

Золатавалютныя рэзервы Беларусі зменшыліся да крытычных памераў.

Пра гэта заявіла ў панядзелак галоўны банкір краіны **Надзея Ермакова** падчас выступлення на сесіі Савета Рэспублікі. Паводле яе слоў, у выпадку сур'ёзных эканамічных праблем рэзерваў хапіла б толькі на адзін-два месяцы.

## Газ па 288 долараў?

Старшыня пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце, фінансах і падатковай палітыцы **Аляксандр Антоненка**, адказваючы на пытанне журналістаў, з улікам якой цаны на газ будзе фарміравацца бюджэт наступнага года, паведаміў, што кошт на газ для Беларусі ў 2012 годзе можа скласці 288 долараў за тысячу кубаметраў.

*"Мы працавалі з сакавіка над бюджэтам, зыходзілі з той цаны, якая была па дагаворы летась. Цяпер абяцаюць прымяніць інтэграцыйны каэфіцыент, гучыць сума 288 долараў",* — цытуе Антоненку БелаПАН.

Атрымліваецца, што газ мы будзем купляць па коштах, вышэйшых за сёлетнія, хаця беларускія ўлады неаднаразова заяўлялі, што ў 2012 годзе будзем атрымліваць газ ад Расіі па кошце, значна ніжэйшым за цяперашні. У 2011 годзе, як вядома, цана на газ складала 230 долараў за тысячу кубаметраў на пачатак года, а ў красавіку—чэрвені падрасла да 244,7 долара.

**Ігар ЗАЛЕСКІ.**

## 8 працэнтаў пенсіянераў працуюць

У 1999 годзе гэтая лічба складала 6,7%.

Павялічылася і ўдзельная вага пенсіянераў у агульнай колькасці занятага насельніцтва Беларусі: з 2,8 працэнта ў 1999 годзе да 3,2 працэнта ў 2009-м, калі праводзіўся апошні перапіс насельніцтва.

"Гэта звязана з агульнай тэндэнцыяй старэння насельніцтва рэспублікі, а таксама сведчыць аб наяўнасці, з аднаго боку, попыту на вопытных спецыялістаў высокай кваліфікацыі, з другога боку — вакансій нізкааплатнай руціннай працы, на якія моладзь ідзе неахвотна", — тлумачаць дадзеныя статыстыкі спецыялісты Белстата.

МНЕНИЕ

# Нашли преступников — все равно виноваты

15 сентября в Минске начался самый громкий судебный процесс, которого Беларусь ждала пять месяцев. Граждане нашей страны, конечно, ожидали, когда на скамье подсудимых окажутся люди, которые 11 апреля 2011 года взорвали минское метро. Это бесчеловечное преступление, приведшее к гибели 15 человек и искалечившее множество судеб, коснулось каждого, равнодушных не осталось.

И теперь с удивлением, а порой и с недоумением, можно наблюдать, как отдельные "товарищи" пытаются оправдать тех, кто, особо не заботясь о ценности человеческой жизни, осуществил свой чудовищный план в угоду неудовлетворенным амбициям. Один написал целый панегирик во славу и честь Коновалова и Ковалева. Это практически роман о радостях и горестях, душевных переживаниях и чистоте помыслов белорусских "взрывников". Ему не важно, что сам Коновалов признал, что взрывы в День Независимости в 2008 году и в метро в 2011-м — дело его рук. Главное, воспользовавшись информационным поводом, сделать из "взрывника" очередную "политическую жертву". И что такое для несостоявшегося когда-то следователя боль пострадавших и горе потерявших близких людей в сравнении с политической ангажированностью и меркантильными интересами?

Не знаю, насколько чувство сопереживания развито у представителей правоохранительных органов, но беседовал с одним из таких по поводу подробностей теракта и слышал обиду. За то, что не все верят, за то, что люди не знают и никогда не узнают, каких физических сил, моральных переживаний и нервного напряжения стоили результаты расследования преступления. Непрерывно отрабатывались версии, скрупулезно собирались и изучались остатки взрывного устройства, было сопоставлено бесчисленное количество фактов, опрошены десятки свидетелей, отсмотрена масса видеозаписей камер наблюдения в метро. В результате понадобилось чуть более суток, чтобы после совершения теракта были задержаны Коновалов и Ковалев. И самое парадоксальное, что если бы не нашли преступников — виноваты были бы правоохранители, общество было бы недовольно. Нашли — все равно виноваты, и опять общественность недовольна.

**Степан Николаевич СИДОРОВИЧ.**

*Минск.*

# Точки над «і»

После публикации материала "Что взорвалось в минском метро?" мне тоже пришлось общаться с представителями правоохранительных органов, которые прояснили некоторые моменты по поводу "уникальности" взрывного устройства. Поскольку этим материалом я ни в коей мере не хотела поставить под сомнение выводы экспертов, которые сейчас изучает суд, считаю необходимым внести некоторые пояснения.

Взрывчатое вещество, использованное Коноваловым, действительно хорошо известно специалистам. Но белорусы, а также профессионалы-практики из России и Израиля, где подобные террористические акты не редкость и есть опыт в их раскрытии, пришли к выводу, что взорвавшаяся в Минске 11 апреля бомба была "явно самодельная". Это, как поясняют эксперты, может означать, что взрывчатка была не стандартного типа и в их практике почти не встречалась. По их словам, именно поэтому 13 апреля на брифинге с руководителями штаба по расследованию уголовного дела прозвучала предварительная оценка "уникальности" взрывчатого вещества.

Полагаю, что ряд подробностей, а возможно, и ноу-хау террористов на открытом судебном процессе озвучены не будут. Это действительно было бы недальновидно, поскольку распространение "передового опыта террора" не входит в обязанности правоохранительных и судебных органов. Но профессионалов всего мира белорусская сторона планировала подробно ознакомить с делом "взрывника" из минского метро на международной конференции Интерпола на Мальте. Однако белорусскую делегацию во главе с первым заместителем министра внутренних дел Олегом Пекарским туда не пустили.

Надо признать, что Интерпол действительно был заинтересован в получении подробных сведений о "минской бомбе", поскольку, как несложно догадаться, имел определенную информацию от российских и израильских взрывотехников, которые работали вместе с нашими специалистами. Об этом прямо заявил глава организации Рональд Ноубл. В мае этого года он пошел на беспрецедентный шаг и приехал в Минск, покинув Международную конференцию Интерпола на Мальте, чтобы получить подробные сведения о минском теракте. Господин Ноубл отметил, что придает особую значимость своему пребыванию в Беларуси и даже впервые в должности Генерального секретаря Интерпола покинул официальное мероприятие этой организации для посещения другой страны.

Пояснениями белорусских специалистов, насколько можно было понять по заявлениям, был удовлетворен. "Информацию, которую мне предоставили в Беларуси (о расследовании теракта в минском метро), должны были узнать все участники конференции. К сожалению, было принято решение, которое не должно было быть принято", — так прокомментировал глава Интерпола факт неучастия в конференции на Мальте представителя МВД. И признал, что теракт в минском метро удалось быстро раскрыть благодаря высокому уровню технической оснащенности, профессионализму белорусских правоохранителей и сотрудничеству с международными полицейскими организациями.

Поэтому мне бы хотелось быть правильно понятой: ни в коем случае нельзя говорить, что происшедшая трагедия — дело рядовое и обычное. В нем все уникально. И то, что произошло, и то, где произошло, и количество жертв, и то, что слесарь-самоучка выполнил работу, с которой не могут справиться опытные химики. И то, как он это сделал. Вопросы по этому делу мы задаем только с одной целью: общество должно иметь гарантию того, что в будущем такие "уникальные" истории не повторятся... Мы исходим из того, что чем меньше будет вопросов без ответов, тем спокойнее будет жить нам всем.

**Светлана КАЛИНКИНА.**

## Роман Протасевич вернулся домой

*На этой неделе он планирует приступить к занятиям в школе.*



*— У меня все хорошо, все отлично,* — Роман Протасевич, за судьбой которого еще пару дней назад следило все интернет-сообщество и о котором подробно рассказала "Народная Воля" в минувшем номере, немногословен. Но голос подростка звучит радостно: — *Вернулся к родителям. Мы пошли на обоюдные уступки: где-то родители приняли мою позицию, где-то — я их.*

*В понедельник отнес недостающие документы в 94-ю школу. Оказывается, когда я туда поступал, не все до конца было оформлено. Как только все формальности закончатся, приступлю к занятиям. Сейчас главное — закончить школу. А потому буду думать, куда поступать дальше, чтобы получить высшее образование и профессию.*

Роман, судя по всему, сознательно не рассказывает нюансы своего примирения с родителями. И мы не стали задавать ему лишних вопросов: кто сделал первый шаг, как встретили его родители и т.п. Потому что не это самое важное в данной ситуации. Главное, что 16-летний подросток дома.

**Мария ЭЙСМОНТ.**

ДАЖЫНКІ-2011

# Жару далі напоўніцу...

Тры дні ў Маладзечне фантаніраваў Рэспубліканскі фестываль-кірмаш "Дажынкі-2011". Як і абяцалі губернскія ўлады, пятнаццатыя па ліку "Дажынкі" атрымаліся самымі грандыёзнымі з усіх мінулагодніх. Але ў чым тая асаблівасць і непаўторнасць юбілейных дамалотак?.. Усё гэта паспрабаваў высветліць наш карэспандэнт, пабываўшы на свяце "апошняга снапа"...



Яшчэ па дарозе ў Маладзечна (пачынаючы ад Ляхавіч) увагу прывабілі спрасаваныя саламяныя кацёлкі, панастаўленыя ўзбоч шашы. Мусіць, гэта і ёсць рэжысёрская знаходка "ўдасканаленага сцэнарыя". Але чаму не снапы, а менавіта спрасаваная салома ды яшчэ ў выглядзе не то "чабурашак-матрошак", не то язычніцкіх ідалаў?.. Снапы, зразумелая справа, даўно выйшлі з ужытку, бо не сярпамі жыта жнуць, а камбайнамі. Але ж сноп, як ні круці, — традыцыйны сімвал векавой хлебаробскай справы... Не будзем, аднак, чапляцца да ўвасобленай аўтарамі (спадзяюся, не язычніцкай) задумы — на двары як-ніяк XXI стагоддзе. Лепш прыспешым на свята-кірмаш у "горад сонца"...

Там яшчэ ў пятніцу ўганароўвалі герояў жніва. Іх было столькі, што ўрачыстую дзею расцягнулі на суботу. Праўда, суботнім стаханаўцам пашэнціла менш: камп'ютары ды розныя іншыя ўзнагароды (а камусьці — дзевяцімільённыя чэкі) уручала не "першая асоба", а больш дробныя начальнікі. Кажуць, быццам "першую" чакаў у сталіцы не менш важны і абавязковы рытуал — хакейная трэніроўка... Як бы там ні было, а сваё героі атрымалі і ўжо надвячоркам (пасля вялікага канцэрта ў амфітэатры) маглі "абмыць" свае трафеі па старой і добрай традыцыі... Між іншым, на цяперашніх "Дажынках" (у адрозненне ад мінулагодніх у Лідзе) "абмывачны" прадукт быў у поўнай наяўнасці, і яго не трэба было ўпотай, як кажуць, закладваць за каўнер. Дробязь, а прыемна... Яшчэ болей усцешвала, што, нягледзячы на такую дэмакратыю, нідзе ў горадзе не было відаць добра падпітых і праз меру вясёлых. Не ведаю, як там было на трэці дзень, а ў першыя два — дакладна. Ці то культура піцця адразу скокнула на нябачаную вышыню, ці то ахоўнікі парадку былі на вышыні. Дарэчы, апошніх было нямерана, і яны спраўна і досыць тактоўна абшуквалі кожнага, хто перасякаў фестывальна-кірмашовую мяжу.

Сёлетні дажыначны фестываль-кірмаш вылучаўся (і ў тым галоўная адметнасць) небывалым размахам: тэатралізаваныя шэсці, парады розных байкераў, бясконцыя эстрадна-папсовыя наярванні самадзейных і прафесійных музыкаў і яшчэ сто пудоў усякай усячыны — на любы густ. Асабліва пашэнціла дзецям, бо розных забавак, пачынаючы ад "пап-корму" і заканчваючы стылізаваным дыснейлэндам, хапала — абы ў бацькоў кішэня не дзіравіла... Што ж адносна дарослых спакусаў, то іх — таксама бязмежнае мора-акіян. Вядомая справа: "беларускі агарод, які смачна корміць круглы год", абрынуўся на Маладзечна, нібы тая акіянская хваля. Паўсюль, куды ні зірні, з густам упрыгожаныя карчомкі, крамы, імправізаваныя двары, выставы твораў народнага мастацтва, не кажучы ўжо пра тавары розных фірм і фірмачак. Кірмаш, карацей... Нават Мінскі мотавелазавод прыпёр на "Дажынкі" ўсю сваю "мотавелафотатрактарную" лінейку. І ўсё можна памацаць рукамі, прымераць, нават узяць на зуб... Адно купіць не кожнаму па зубах, бо цэны — не вышапчаш. Канечне, хто атрымаў свае потам заробленыя дзевяць мільёнаў, ці колькі там, то мог пагудзець, а вось астатнія... хіба толькі падзівіцца, колькі ж у нас усяго-ўсякага. На шашлык які ці куфель піва ў людзей заўсёды знойдзецца капейчына, асабліва ў такое свята, а на большае па цяперашнім часе цяжка разлічваць. Прыкладна гэтак казалі людзі, з якімі давялося перакінуцца словам. Валянціна Аляксандраўна Кіеня, народная майстрыха з Капыльшчыны, прывезла ў Маладзечна свае малыя кросны і проста на вуліцы дэманстравала, як ткуцца вясковыя дываны. "Людзі цікавяцца, — распавядала мне, — але каб купіць, то не вельмі, бо грошай нямашака..." Прыкладна гэтак распавядалі і іншыя, адно месцічы радаваліся: маўляў, "цырк з'едзе", а прыхарошаны, абноўлены горад застанецца... Горад і напраўду набыў прывабны выгляд, бо столькі ўсяго набудавалі, так усё адчысцілі-адпаліравалі — душа радуецца.

Тым часам "Дажынкі" спявалі, гулі і танчылі на ўсю моц дынамікаў, аж да самай ночы. Пераважна сіламі заезджых самадзейных і прафесійных артыстаў, якія давалі жару па поўнай праграме. Народ жа кружыў па запруджаных вуліцах, плошчах і завулках, наталяючы сябе атмасферай гуллівага свята і дзівячыся ўсяму, што было закладзена ў сцэнарыі самых грандыёзных "Дажынак" за ўсю гісторыю.

**Георгій ЧЫГІР.**
**Фота аўтара.**

*Дзмітрый УСС:*

# Мужчына павінен заставацца мужчынам

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**— Якім чынам?**

— За кошт дапаўненняў і змен у выбарчым заканадаўстве.

**— А хто будзе ўносіць такія змены?**

— Хто? Дзмітрый Усс будзе гэта рабіць.

**— Застаецца толькі драбяза — стаць дэпутатам.**

— Усё гэта адбудзецца даволі хутка. Разум пераможа маразм. Сёння ніхто не стане дэпутатам. Толькі ў наступным годзе. Дзеля гэтага трэба зрабіць канкрэтныя крокі, якія дазволяць людзям выбіраць. Якія? Я не буду цяпер гэта агучваць, бо мяне зноў закрыюць. Аднойчы мяне ўжо закрылі. Калі я цяпер вам усё пачну распавядаць, падумаюць-падумаюць і зноў мяне закрыюць.

**— Прыярытэтным накірункам для вас застаецца змена выбарчага заканадаўства і ўдзел у выбарах?**

— Так. У мяне шмат жадання ўносіць змены ў Крымінальны кодэкс, ахову здароўя, сацыяльную палітыку, Жыллёвы кодэкс, пенсіённыя рэформы патрэбны. Шмат трэба зрабіць для грамадства, у якім мы жывём. Пакуль не буду казаць, бо бачу, што мае ідэі некаторыя палітыкі цяпер выдаюць за свае. Непрыемна бачыць. Раней гэтыя людзі казалі зусім іншыя рэчы, а цяпер зразумелі, што Усс мае рацыю, хаця раней крытыкавалі і смяяліся. Гэта палітыкі з дэмакратычнага лагера. Ухапіліся за мае ідэі, маўляў, Усс казаў разумныя рэчы. На жаль, ёсць такія, якім нават і ўлада не патрэбна. Галоўнае — атрымаць нейкія гранты і г.д. Іх задавальняе рэжым, бо яны такім чынам зарабляюць грошы. Гэта бізнес такі — рабіць выгляд, што змагаешся з рэжымам. Няхай так будзе хоць 30 гадоў. Галоўнае — атрымаць грант і напісаць справаздачу. Занялі свае нішы і сочаць, каб нікога туды не пускаць. А тут з'яўляецца нейкі Усс, які рэальна хоча змяніць да лепшага сітуацыю ў Беларусі. Яны не зацікаўлены ў гэтым. Палітыкаў, якія сапраўды хочуць змяніць жыццё народа да лепшага, у нашай краіне не так і шмат...

**— Вы ведалі, што вас могуць пазбавіць волі, але пайшлі на суд і на абвяшчэнне прысуду. А дома ў вас засталіся дзеці. Адзін зусім немаўлятка, другі — падлетак-школьнік. Жонка маладая, якая сама не мае жыццёвага досведу. Трэба было рабіць свой выбар.**

— Разлічвалі, што я збягу. І жонка прасіла з'ехаць за мяжу. Але я яе падрыхтаваў і маральна, і матэрыяльна забяспечыў. Па-першае, я ведаў, што ні Усс, ні Статкевіч, ні Саннікаў не вінаватыя. Па-другое, праўда заўсёды перамагае. Па-трэцяе, калі б я збег, то ўскосна прызнаў бы сваю віну і Аляксандру Рыгоравічу гэта было б вельмі зручна. На мяне аказвалі маральны ціск для гэтага. Але калі пачаў рабіць нейкую працу, то трэба яе даводзіць да канца. Мужчына, калі лічыць сябе мужчынам, павінен рабіць мужчынскія ўчынкі. Трэба быць паслядоўным. Гэта цэніцца ў жыцці. Мужчына павінен заставацца мужчынам у любой сітуацыі.

**— Сапраўды важна, калі гэта не на словах, а на справе. Прайшло літаральна пару дзён, як вы на волі. Як яно?**

— Ды вось пакуль пад'ём а палове сёмай раніцы. Звычка... Заўважаю цяпер такія рэчы, на якія раней не звяртаў ніякай увагі і аб якіх нават не задумваўся. Напрыклад, пайсці куды хочацца, рабіць што хочацца, хатні камфорт... Вось збіраюся ў школу да настаўнікаў Вані. Я разумею, што хлопчык быў у стрэсавым стане. Трэба паразмаўляць з настаўнікамі, можа, яму патрэбны нейкія дадатковыя заняткі. Ну і ўвогуле трэба працаваць, вырашаць розныя праблемы. Жыццё працягваецца...

**Любоў ЛУНЁВА.**

*Валерий ЦЕПКАЛО:*

# «Мне хотелось бы видеть каждого белоруса хозяином...»



*Серию толковых публикаций о том, как сделать белоруса хозяином своей земли, выложил в своем интернет-дневнике директор Государственного учреждения "Администрация Парка высоких технологий"* ***Валерий Цепкало.*** *Вот некоторые его мысли.*

## Продать подвал за 35 тысяч

— В трех километрах от минской кольцевой дороги видел с десяток то ли бывших складов, то ли конюшен, — *рассказывает Валерий Вильямович*. — Состояние конструкций довольно хорошее. Фундаменты, кирпичные стены, деревянные крыши, покрытые шифером. Шифер, правда, потрескался и кое-где в крышах зияют дыры.

Это и неудивительно. Судя по состоянию зданий, заросших травой и кустарниками, они находятся в заброшенном состоянии лет 15—20. Таких строений по всей стране тысячи, если не десятки тысяч. Принадлежат они, естественно, государству. Их распорядители — чиновники, которым до этих строений нет никакого дела. *"Дайте денег,* — говорят они, — *и мы их отремонтируем".*

Возможно, так оно и есть. За деньги отремонтируют (как когда-то за государственные деньги эти сооружения построили). Но пройдет немного времени, и они опять придут в негодность. ***Ведь чиновник будет что-то делать, если ему постоянно будут давать деньги.***

Действительно, невозможно себе представить чиновника, который пошел бы в банк, взял небольшой кредит, закупил шифер, сам полез бы на крышу, заменил бы его, потом взял бы топор и косу, вырубил кустарник, выкосил траву, покрасил бы здание, договорился о хранении картофеля или моркови и т.д. и т.п.

Невозможно себе представить такого чиновника, который после работы своими руками улучшал бы государственную собственность. И винить его в этом нельзя. С какой стати он должен что-то делать с имуществом, которое не имеет к нему никакого отношения? Дадут деньги — наймет рабочих, они что-то сделают. Но напрягаться, договариваться, думать — он не станет.

Мне опять вспомнился "хомсед-акт" **Авраама Линкольна** в США. Он выиграл гражданскую войну в США не оружием, а издав в 1862 году "хомстед-акт", согласно которому каждый желающий американец мог получить до 60 гектаров земли за... 15 долларов. Но! Был установлен срок, в течение которого накладывались ограничения на любые сделки с землей. В течение пяти лет ее нельзя было продать, отдать в аренду, передать кому бы то ни было в управление. Через пять лет приезжает комиссия. Если на участке земли стоит дом, пасется скот, обработана земля — комиссия закрепляет акт продажи, и участок земли переходит в "вечное владение" фермера. Отныне он может им распоряжаться как угодно — продать, отдать в управление, передать по наследству. Но он уже закрепился за этой землей, вложил в нее свои "пот и кровь", и расстаться с ней даже за деньги уже не готов. Если же комиссия видит, что земля не используется, хозяйство на ней никто не ведет, она возвращает "фермеру" 15 долларов, изымает у него участок и передает его другому потенциальному землевладельцу. Так сложилось самое эффективное сельское хозяйство в мире.

Были и реформы **Петра Столыпина** в России, впервые озвученные им в Гродно, где он был губернатором, которые тоже имели целью создание массового класса собственников.

Как бы в данной ситуации поступили великие реформаторы? Наверное, отдали бы эти склады за "одну базовую величину" без права перепродажи в течение трех или пяти лет. Через три года приехала бы комиссия. Если новый хозяин сделал там склады, где хранит зерно или овощи, или создал на этом месте конюшню, или стал его использовать любым иным образом — получи это здание в вечную собственность. Делай с ним что хочешь — дари, наследуй, продавай. Ты заслужил это своим трудом. Ты ведь сделал так, что вовлек заброшенное здание в хозяйственный оборот. Оно, по большому счету, стало частью экономики страны.

***Таких заброшенных зданий много. По всей стране.*** И не только в лесу. Например, в историческом центре Гродно ***стоят заброшенные казармы,*** которые из года в год подвергаются коррозии, постепенно приходят в негодность. А ведь у них есть потенциал быть вовлеченными в хозяйственный оборот, давать рабочие места, обеспечивать занятость, делать людей независимыми от постоянных государственных подачек (в виде финансирования работ).

***То же и в отношении ресторанного бизнеса. У нас количество ресторанов и точек питания на душу населения в разы, а то и в десятки раз меньше, чем в европейских или азиатских странах. У нас практически нет "кофеюшек", куда люди могли бы заходить по дороге на работу. Выпил кофе, съел бутерброд или блинчики, которые бы готовили сами хозяева этих точек общественного питания.*** Они бы знали своих постоянных клиентов в лицо, рассматривали бы их как родных и никогда не предлагали бы им несвежих продуктов***. И не нужны толпы проверяющих и контролеров.*** Ответственность владельца такого бизнеса перед своими клиентами — лучший контролер.

Такие маленькие кафе будут не хуже, чем большие рестораны в центре города, которыми владеют россияне, или итальянцы, или богатые белорусы, рассматривающие это как очередной проект в цепи других видов бизнеса, где белорусы — лишь наемные: повара, официанты, бухгалтеры *(кстати, хороший ресторан в Минске должен иметь шесть бухгалтеров).*

Здесь также можно применить опыт "хомстед-акта" — формирования трудовой собственности. Продать потенциальному "ресторатору" подвал в старом доме за "базовую величину". Через три года посмотреть. Работает ресторан — собственник получает его в "вечное пользование". Не работает — вернуть "базовую величину" и предложить имущество другому.

Эти меры будут не только способствовать формированию в стране класса собственников, но и менять (преображать) облик наших больших и маленьких городов, формировать новую культуру человеческих взаимоотношений.

## Станут ли белорусы нацией собственников?

— У меня есть мечта: мне хотелось бы видеть каждого белоруса хозяином, — *пишет Валерий Цепкало.* — Хозяином земли, хозяином заводов, фабрик... Хотелось бы, чтобы каждый наш гражданин обрел собственность в своей стране.

Обладание собственностью приближает человека к Богу. Ведь Бог есть Господь, господин, собственник бытия. И человеку, чтобы приблизиться, уподобиться Богу, необходимо также стать господином, собственником, хозяином. С собственностью человек обретает базис личностного достоинства. ***Человек гордится собственностью. Гордится он и своей страной — местом, где он является хозяином. Такую родину он ни на что не променяет и не даст в обиду никому!..***

Когда-то я начинал свою дипломатическую карьеру в советском посольстве в Финляндии. Время от времени меня приглашали к себе финны в свои "летние домики". Это были не политики, не бизнесмены, не чиновники. Это были простые люди — рядовые инженеры, школьные учителя, клерки в обычных финских компаниях. Пока я не побывал в гостях у финнов, я переводил на русский язык финское слово kesamokki не буквально — "летний домик", а приближенно к пониманию советского человека, как "дача". В то время это было понятней. Практически у всех советских людей в то время были дачи. Была дача и у моих родителей, работавших инженерами на гродненском "Азоте". Участок в пять соток земли (больше было нельзя), на котором мы построили небольшой домик в 20 или 25 кв. метров (больше также было строить нельзя). Но у финнов это оказалось чем-то совершенно иным...

Финская "дача", которая имелась у каждой городской финской семьи, представляла собой большой полноценный дом, расположенный, как правило, на берегу живописного озера или речки, окруженный лесами. Это мог быть как отдельно стоящий дом, так и небольшие "хутора" по 3—7 домов. Финн является хозяином не только этого дома, но и большого участка земли — до нескольких десятков гектаров лесных или иных земельных угодий.

И еще. Каждый рядовой финн помимо того, что он является землевладельцем, является еще и совладельцем своей компании. ***На каком бы производстве он ни работал, он является акционером своего предприятия, имеет акции участия и свою долю в прибыли компании.*** Это мотивирует финна не только хорошо работать, но и заботиться об эффективности компании, быть одновременно и сотрудником, и контролером (не надо содержать многочисленные контрольные органы) — сами акционеры являются лучшими проверяющими деятельности руководства своего предприятия.

***Тогда возникает настоящий патриотизм***. ***Тогда у каждого гражданина возникает ощущение, что "это моя страна", это страна, где я — хозяин, это страна, дающая мне возможность реализовываться как субъекту, как личности...***

Приватизация, на мой взгляд, должна преследовать две основные цели:

1. Наделение каждого белоруса достойной долей в национальном богатстве страны.

2. Привлечение инвестиций в модернизацию предприятий и получение средств в государственный бюджет.

***Белорусы могут стать нацией собственников. Для этого их необходимо наделить землей и средствами производства. Наделить той собственностью, которая намертво связывала бы наших людей со своей этнической родиной. Той собственностью, которая из народа, этноса делает нацию, а из человека — гражданина.***

Этот процесс может идти по следующим направлениям.

*а) Владение акциями предприятий, имеющих национальное значение.*

Это прежде всего такие предприятия, товарами или услугами которых пользуются практически все граждане Республики Беларусь. Массовое владение акциями таких предприятий всеми гражданами страны позволит создать стимул для приобретения отечественных товаров.

Например, ***если большинство белорусов будет владеть акциями "Коммунарки", то это подтолкнет наших людей к покупке конфет именно этой фабрики, а не, скажем, Godiva или Lindt.***

То же самое и в отношении "Милавицы", "Горизонта", "Керамина" и многих других белорусских предприятий. К таким предприятиям можно отнести и национальную авиакомпанию "Белавиа". Если наши граждане будут владеть акциями "Белавиа", то это будет их стимулировать к использованию национального авиаперевозчика.

Практически любой гражданин Японии владеет акциями компании Sony. И когда японец идет в магазин, перед ним не стоит выбор, какой телевизор, компьютер или фотоаппарат купить — HP, Dell, IBM, Philips, Sony или LG. Так же практически любой кореец владеет акциями Samsung. Как вы думаете, какой мобильный телефон он приобретет — Nokia, Ericsson, Samsung или Siemens?

*б) Владение акциями предприятий трудовыми коллективами.*

Речь идет о владении акциями предприятий в первую очередь теми, кто на них работает. Это те предприятия, товар или услуга которых не имеет национального распространения. К ним могут относиться как небольшие заводы и фабрики, так и такие крупные предприятия, как Белаз или МАЗ.

Владение акциями своего предприятия будет способствовать повышению мотивации сотрудников и росту производительности труда. Сами работники предприятия будут заинтересованы в его эффективной работе, что снимает необходимость содержания большого количества различных государственных проверяющих органов...

*в) Приватизация предприятий, представляющих собой национальное достояние страны.*

К ним не относятся, как могло бы показаться на первый взгляд, такие предприятия, как "Белтрансгаз" или "Нафтан". Дело в том, что эти предприятия полностью "завязаны" на российские энергоносители. Без российского газа стоимость "трубы" не превышает стоимости металла, затраченного на ее изготовление.

Другое дело — "***Беларуськалий". Это — национальное достояние нашего народа. Это то сырье, которым нас наградила природа. И право всех белорусов — иметь свою долю от этого, нашего общего, богатства.***

В приватизации этого предприятия можно учесть опыт тех стран Ближнего Востока — таких как Кувейт, Катар, Объединенные Арабские Эмираты, которые в отличие от России предоставили возможность своим гражданам пользоваться благами от экспорта нефти. Это значит, что ты по крайней мере в течение определенного периода времени не можешь запросто продать свою долю, пропить ее или проиграть в казино.

Для этих целей были созданы специальные паевые фонды, которые управляют акциями граждан, являющихся совладельцами нефтедобывающих компаний. В задачах фонда установлены цели, на которые можно снимать деньги. Хочешь получить образование — снимай деньги, нужно медицинское обслуживание — снимай деньги, нужна помощь в строительстве жилья — часть средств тебе предоставят из этого фонда.

Из этого же источника можно получать и дополнительные пенсионные выплаты, что ***позволит постепенно перейти в Беларуси на накопительную пенсионную систему, являющуюся более эффективной, чем "перераспределительная", при которой пенсии выплачиваются за счет взимания налогов с ныне работающих.*** У нас одно поколение фактически финансирует другое; это отрицательно сказывается на желании людей откладывать пенсионные сбережения, так как никто не знает, кому идут деньги. В современном мире каждый считает, что человек должен нести личную ответственность за себя и за свое будущее (в том числе и пенсионное).

Особняком, как и "Беларуськалий", стоит еще одно предприятие — "**Белтелеком".** Здесь общенациональное владение акциями также будет содействовать росту инвестиций в эту сферу и постоянное внедрение этим предприятием технологических новинок.

*г) Превращение колхозов и совхозов в акционерные общества. Преобразование нерентабельных колхозов в добровольные кооперативы — производственные, потребительские и сбытовые. Этому способствует развитие различных форм государственного кредитования — ипотечного, мелиоративного, технического, на закупку семенного фонда, землеустроительного.*

На самом деле кредитование на закупку семенного материала для крепких крестьянских хозяйств, хуторов и фермеров может оказаться эффективным инструментом повышения эффективности сельского хозяйства. Например, в Беларуси, создается впечатление, что возделывают лишь один сорт картофеля (по крайней мере, в магазине можно встретить лишь его; он легко узнаваем по характерному песку, который осыпается с картофелин, имеющих бесформенный вид и находящихся в примитивной сетке, в которую он упакован). ***Государство финансирует огромный Институт картофелеводства. Во многих случаях будет проще и гораздо дешевле завезти картофель из Айдахо,*** где только в магазине можно отыскать 30 сортов картофеля — от большого до самого маленького, от белого цвета до красного, от сортов, которые лучше использовать для жарки, до сортов, которые лучше всего запекаются в кожуре.

Очень полезным могут быть различные формы сбытовой кооперации. Любой зарубежный картофель — хорошо промыт, красиво отсортирован и упакован. Товарному виду сегодня придают в мире не меньшее значение, чем "центнерам с гектара". На совместные проекты фермерских хозяйств, которые в отличие от колхозов могут производить картофель с высокими потребительскими свойствами, банки могли бы в первую очередь предоставлять кредитные ресурсы...

## Обрести достоинство

— Без превращения белорусов в нацию собственников невозможно преодолеть отчуждение людей от родной земли и от построенных на ней производств, — *убежден Валерий Цепкало.* — И наоборот. Когда наше общество превратится в собственников — заводов, предприятий, земли, тогда у людей исчезнет отчуждение — от семьи, своего поселка, города, страны... Они перестанут быть безразличными к своей стране "перекати-поле", срывающимися со своего места и отправляющимися туда, где им чуть больше платят. Они обретут достоинство и уже никогда не захотят презрительно именоваться "гастарбайтерами". Они перестанут думать о том, чтобы ехать на сбор винограда во Францию, ежевики и клюквы в Финляндию или работать на химическом предприятии в Швеции или на стройке в Германии...

ІНІЦЫЯТЫВА

# *Алеся Бяляцкага — на прэмію Нобеля!*

*Учора было абвешчана аб стварэнні міжнароднага аргкамітэта па вылучэнні праваабаронцы Алеся Бяляцкага на Нобелеўскую прэмію 2012 года.*

Да аргкамітэта ўжо далучыліся 29 грамадскіх дзеячаў з усяго свету: расійская праваабаронца Людміла Аляксеева, старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонка Сурвілла, рэктар Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта Анатоль Міхайлаў, кіраўнік Freedom House Дэвід Крэймер, былы кіраўнік АБСЕ ў Мінску Ханс-Георг Вік, беларускія праваабаронцы Раіса Міхайлоўская, Алена Танкачова, Валянцін Стэфановіч, старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў Жанна Літвіна...

— Яшчэ два месяцы таму пачалася праца па стварэнні гэтага міжнароднага аргкамітэта, але самае галоўнае наперадзе, — распавяла **Жанна Літвіна**. — Зараз мы павінны разгарнуць арганізацыйную работу па вылучэнні Алеся на прэмію. А вылучаць па пратаколе могуць парламентарыі краін Еўрасаюза, гэта могуць быць прафесары паліталогіі ўніверсітэтаў, сябры ўрадаў альбо Нобелеўскія лаўрэаты мінулых гадоў. Чаму менавіта Алесь Бяляцкі? Пасля хвалі рэпрэсій супраць лідараў апазіцыі пад ціскам аказаліся журналісцкая супольнасць і праваабарончыя арганізацыі. Алеся я ўспрымаю як сумленнага чалавека і з вялікай павагай стаўлюся да таго факта, што ён не пакінуў краіну, калі даведаўся аб распачатай справе. Але мог гэта проста зрабіць. Гэта вельмі мужная грамадзянская і чалавечая пазіцыя...

Нагадаем, што віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека, праваабаронца Алесь Бяляцкі быў затрыманы ў Мінску вечарам 4 жніўня. 12 жніўня яму прад'явілі абвінавачанне па частцы 2 артыкула 243 Крымінальнага кодэкса (утойванне даходаў у асабліва буйным памеры). Падставай для распачынання крымінальнага пераследу стала інфармацыя аб рахунках праваабаронцы ў літоўскім і польскім банках, перададзеная беларускім уладам Мінюстам Літвы і Генпракуратурай Польшчы ў рамках дагавораў аб прававой дапамозе з Беларуссю.

Па словах Валянціна Стэфановіча, зараз справа перададзена ў пракуратуру, суд можа пачацца ўжо ў другой палове гэтага месяца.

**Алесь СВЯТЛАНІЧ.**

АФІЦЫЙНА

## *Колькі валюты скупілі беларусы?*

Насельніцтва за студзень—жнівень 2011 г. купіла ў банках валюты амаль на чвэрць менш, чым за тыя ж восем месяцаў 2010 года. Як паведамляе Нацбанк, усяго за гэты перыяд грамадзянам удалося купіць у банках больш за 3 млрд долараў. Характэрна, што ў жніўні гэтага года, калі валюты ў вольным продажы не было, людзі прымудрыліся купіць 72,5 млн долараў, што на 11,5% менш, чым у ліпені.

ТЫМ ЧАСАМ

## *Прадалі больш, чым купілі*

За два тыдні, мінулыя з пачатку работы дадатковай сесіі на Беларускай валютна-фондавай біржы, беларусы прадалі ў абменнікі амаль у чатыры разы больш долараў ЗША, чым купілі.

За перыяд з 14 па 28 верасня банкі набылі ў фізічных асоб больш як 188,6 млн долараў, а прадалі — амаль 50,9 млн, або ў 3,7 раза менш.

Аналагічная сітуацыя складваецца з суадносінамі куплі-продажу іншых відаў замежнай валюты.

Што датычыцца аб'ёмаў здзелак па асноўных валютах на дадатковай сесіі БВФБ, то за перыяд з 14 па 29 верасня ў ходзе таргоў было прададзена 249,5 млн долараў, 110,1 млн еўра і 5,3 млрд расійскіх рублёў.

ПАДЛІЧЫЛІ

## *Са студзеня беларусаў стала менш на 13,2 тысячы чалавек*

*Колькасць насельніцтва Беларусі на 1 верасня склала 9 млн 468 тыс. чалавек. Пра гэта паведаміла прэс-сакратар Нацыянальнага статыстычнага камітэта Алена Кандраценка.*

*У параўнанні з 1 студзеня жыхароў краіны стала менш на 13,2 тыс. чалавек.*

Скарачэнне колькасці насельніцтва абумоўлена перавышэннем на 20 тыс. чалавек колькасці памерлых над колькасцю народжаных пры дадатным міграцыйным прыросце 6 тыс. 817 чалавек (у студзені-жніўні ў Беларусь прыбылі 11 тыс. 203 чалавекі, выбылі 4 тыс. 386), паведамляе *belta.by.*

Колькасць жыхароў за восем месяцаў павялічылася толькі ў Мінску — з 1 млн 864,1 тыс. чалавек на 1 студзеня да 1 млн 867,4 тыс. чалавек на 1 верасня. У астатніх рэгіёнах рэспублікі колькасць жыхароў за студзень—жнівень зменшылася. У выніку на 1 верасня ў Гомельскай вобласці налічвалася 1 млн 432,3 тыс. чалавек, у Мінскай — 1 млн 409,8 тыс., у Брэсцкай — 1 млн 394,2 тыс., у Віцебскай — 1 млн 216,6 тыс., у Магілёўскай — 1 млн 83,6 тыс., у Гродзенскай — 1 млн 64,1 тыс. чалавек.

ТАКОЕ ЖЫЦЦЁ

# Кантрабандысты хаваюць, а памежнікі шукаюць...

*Незвычайную «гульню ў хованкі» можна назіраць кожны дзень на беларуска-польскай мяжы*

Накіроўваючыся ў Польшчу, вы можаце захапіць не больш за тры пачкі цыгарэт, прычым адна з іх павінна быць адчынена. Маўляў, вязу для сябе, а не прадам іх на бліжэйшым еўрапейскім прыпынку. А пачак цыгарэт, між іншым, у Польшчы каштуе каля трох-чатырох еўра. Згадзіцеся, няблага можна нажыцца, загнаўшы наш "Магнат", які на радзіме каштуе капейкі.

Выгада стопрацэнтная, тут нават дзіця разбярэцца. Таму і вядзецца на польска-беларускім памежжы няспынная "гульня ў хованкі". Пачынаецца ўсё з чакання цягніка. Паказаўшы свае законныя тры пачкі на беларускім прапускным пункце, які знаходзіцца на цэнтральным чыгуначным вакзале Гродна, пасажыры пачынаюць чакаць цягнік. Цыгарэты ў большай колькасці набываюць у зале чакання. Пра вышэйзгаданыя тры пачкі ніхто і чуць не хоча. Набываюць блокамі і нават каробкамі.

Цікава назіраць за жанчынамі, якія з дапамогай скотча лепяць пачкі на рукі, жывот, ногі. Піхаюць цыгарэты ў, як кажуць, цяжкадасяжныя месцы. Але самае цікавае пачынаецца, калі падыходзіць электрацягнік, які за паўтары гадзіны мусіць давезці пасажыраў ад абласнога беларускага цэнтра Гродна да сталіцы Падляшскай гміны Беластока.



Да цягніка народ кідаецца амаль са спартыўным імпэтам. Галоўнае — хутчэй заняць месца, знайсці выгадную пазіцыю. Месцы займаюцца з тым разлікам, каб было лягчэй хаваць кантрабанду, таму часцяком простыя людзі вымушаны ехаць да мяжы стоячы — сядзенні акупіруюць "для справы".

Як толькі цягнік пачынае рухацца, надыходзіць час для самага цікавага. Мэта "кантрабасаў" (так ласкава называюць перавозчыкаў мясцовыя) — распіхаць сваё дабро так, каб яго не знайшлі польскія памежнікі. На ўсё пра ўсё каля 30 хвілін. На выхадзе з вагонаў стаяць вартавыя, а ў цэнтры цягніка кіпіць справа. На маіх вачах малады чалавек з дапамогай маленькай адвёрткі скруціў лямпу са столі, потым адчапіў абшыўку, дастаў пенапласт, які закладзены паміж абшыўкай і дахам вагона. Складаная тэхнічная аперацыя праводзілася недарэмна — выкінуўшы пенапласт, малады чалавек запіхаў на яго месца некалькі блокаў цыгарэт. На такіх аб'ёмах у Польшчы юнак заробіць каля 400 еўра.

Праўда, заўжды ёсць шанец, што хованку знойдуць памежнікі. Бо польскія "стражгранічны" ўваходзяць у вагон на пагранічным пункце "Кузніца" з адвёрткамі і нажамі. Яны ведаюць, дзе шукаць папяросы, — прастукваюць абшыўку, заглядаюць пад пластыкавыя сядзенні, інспектуюць вокны.

Цікава, але памежнікі і кантрабандысты ўжо даўно ведаюць адзін аднаго ў твар. Шмат хто з беларускіх "кантрабасаў" мае "карту паляка" і за дзень некалькі разоў можа здзяйсняць рэйсы ў Польшчу.

Калі памежнікі заканчваюць свае пошукі, нехта з кантрабандыстаў абавязкова застаецца без тавару. Бывае. Значыць, пашчасціць у іншы раз...

Пасля памежнага кантролю цягнік пусцее. "Кантрабасы" вельмі рэдка даязджаюць да Беластока. Навошта, калі ў памежным населеным пункце "Кузніца" ўжо даўно ёсць сябры і пакупнікі?

**Марыя МАЛЕВІЧ.**



# *Будзем эканоміць ваду*

*У Беларусі павышаны тарыфы для насельніцтва на тэхабслугоўванне, цеплавую і электрычную энергію і ўведзена дыферэнцыраваная аплата за водазабеспячэнне*

Дзейныя тарыфы на паслугі па тэхнічным абслугоўванні жылых дамоў павышаны на 3%, на цеплавую энергію для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння — на 3,2%, на электрычную энергію — на 15%.

Самае цікавае — гэта новы парадак аплаты за карыстанне вадою. Беларусы, якія жывуць у кватэрах (жылых дамах), аснашчаныя прыборамі індывідуальнага разліку расходу вады, будуць аплачваць па тарыфах, устаноўленых заканадаўствам Беларусі, 140 літраў вады ў суткі на чалавека. Той, хто будзе спажываць вады звыш устаноўленага аб'ёму, будзе плаціць за лішкі па ўстаноўленых тарыфах, што забяспечваюць поўную кампенсацыю эканамічна абгрунтаваных затрат на іх аказанне.

А такія "лішкі", мяркуючы па ўсім, будуць. Бо, як паказвае аналіз водаспажывання ў Беларусі за 2010 год, у сярэднім ў Мінску і абласных цэнтрах адзін чалавек расходаваў 153 літры вады ў суткі. Толькі ў населеных пунктах з колькасцю насельніцтва больш як 50 тыс. чалавек гэты паказчык наблізіўся да еўрапейскага і складаў 141 літр на чалавека ў суткі.

Ва ўрадзе мяркуюць, што ўвядзенне дыферэнцыраванай аплаты за паслугі водазабеспячэння і водаадвядзення прывядзе да эканоміі гэтых паслуг самім насельніцтвам і, адпаведна, зніжэння аб'ёмаў іх рэалізацыі на 6—6,5%.

ПО СПРАВЕДЛИВОСТИ?

## *Пенсионеры-депутаты 500 тысяч не получат*

Оказывается, не все неработающие пенсионеры получат материальную помощь. Денег "на картошку" лишили экс-депутатов, которые сегодня находятся на заслуженном отдыхе.

— В указе сказано, что материальную помощь выплатят получателям пенсии. Бывшие депутаты получают не пенсию, а ежемесячное денежное содержание. Поэтому указ на них не распространяется, — объяснила на пресс-конференции причину этого замминистра труда и соцзащиты **Валентина Королева.**

К слову, пенсия бывших парламентариев сегодня составляет около 3 миллионов 200 тысяч белорусских рублей.

**Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.**

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

# Багацей ці жабрак?

**Інтэрнэт "узарвалі" словы старшыні Савета Рэспублікі акадэміка Анатоля Рубінава, які заявіў, што не ведае, якая ў яго зарплата і ці індэксавалася яна. "Я зарабляю, жонка траціць", — сказаў чыноўнік.**

*Чын высокі (хоць не самы)
Нейк прыехаў у сяло.
Пад прымусам — скажам прама,
Бо ахвоты не было.
Указайка: несці ў масы
Веліч Бацькавых ідэй.
На заводы, у калгасы,
Дый наогул — да людзей.
Грымнуў крызіс, як навала,
Горш, чым колісь на вайне...
Люд збяднелы, згаладалы,
Моцна ўладу ён кляне.
Люду ўбіць у клёпкі трэба,
Хай трымае ў галаве:
Хлеба ўдосталь
І да хлеба —
Добра наш народ жыве!
Сход. І слова для даклада
Мае той высокі Чын:
— Я, як прадстаўнік улады,
Вам кажу: няма прычын,
Каб схіляць галовы ў скрусе
І маркоціцца дарма:
На прасторах Беларусі
Сёння крызісу няма.
Сёння б'юцца ў нас рэкорды
На сяўбе і малацьбе.
На нагах стаім мы цвёрда —
Я мяркую па сабе.
Я бадзёры, зухаваты
І, як кажуць, на плыву,
Хоць жа толькі на зарплату —
Ці паверыце? — жыву.
Ды аднак жа, тым не меней,
Я, прызнаюся, пакуль
Не сціскаю грошы ў жмені,
Як жабрак або куркуль.
— А зарплата ў вас якая?
З залы крык. — Які аклад?
— Колькі плацяць мне? Не знаю.
Мусіць жа, не дужа шмат.
Я заўжды, па завядзёнцы,
Суму сціплую сваю
Аддаю любімай жонцы.
Ні капейкі не таю!
Не хаджу таму да крамы
І зусім не знаю цэн.
Літры, метры, кілаграмы...
Я ж у гэтым, як бязмен.
Не шыкуем, як буржуі,
Разам з жонкаю... Але
Каб паесці, вам скажу я,
Ёсць што-кольвеч на стале.
Праўда, з тым, што мае кожны
Тут, у вёсцы, селянін,
Параўнаць ніяк няможна.
Мой наедак — смех адзін.
Вось, да прыкладу, катлеты
З мяса жонка робіць мне.
Неўспадоб наедак гэты!
Вы мне верыце ці не?
Вы ці затаўку, ці сала
Можаце пакласці ў рот...
Хоць бы раз пачаставала
Жонка так за цэлы год!
Ці яшчэ: перакарміла
Балыкамі і ікрой.
Так абрыдла — свет не мілы!
Сплюнуць хочацца парой...
Вам жа з карася ці з плоткі
Юшкі ўдосталь на кастры.
Вы ёй радуеце глоткі,
Мне ж душыся з той ікры!
Вам і вітамінаў годзе:
Кожнаму перападзе
Ці то яблык на гародзе,
Ці цыбуля наградзе.
Мне ж такога не хапае...
Выбар бедны — проста жах:
Ад бананаў і папайі
Аж аскома на зубах.
А якія ёсць напоі?
Ці тэкіла, ці каньяк.
І, дальбог, пітво такое
Больш не лезе мне ў гарляк.
А для вас тут — самагонка,
Нібы Божая сляза...
За яе (хоць супраць жонка)
Я дзвюма рукамі "за"!
Што яшчэ сказаць? З зарплаты
Прыкупіў я "Мерседэс".
Вы ж затое пешшу з хаты
Можаце схадзіць у лес.
Там паветра — кожны скажа! —
Як нектар. Грыбы яшчэ.
Мне ж у Турцыі на пляжы
Сонца ў галаву пячэ...
Не гула, прыціхла зала...
— Гэта ж, людцы, проста здзек, —
Раптам Ганначка сказала. —
Гляньце: гэты чалавек
На адной жыве палучцы.
Во гаротнік, во бядак...
А яму ж яшчэ і ўнучцы
Трэба даць які "пятак".
Ён не рыбу, а вантробы
Есці змушаны — ікру.
Ад заразы ці хваробы
Шчэ сканае не ў пару...
Ці ж мы нехрысці, не людзі?
Дапаможам як адзін
Чалавеку. З нас не ўбудзе,
Калі штось яму дадзім.
— Праўду кажаш ты! — старую
Падтрымаў дзядок Ігнат. —
Я, напрыклад, ахвярую
Чалавеку сала шмат.
Галасоў спагадных хор быў,
Зала ўзнёсла загула...
Чалавеку клункі-торбы
Неслі з усяго сяла.
Хтосьці — бульбы мех няхілы,
Ад кагось — цыбулі пук.
Дзед Карпей прынёс бахілы
І ўюноў аж дзесяць штук.
Мнагадзетная кабета
Так праніклася бядой,
Што дала, забраўшы ў дзетак,
Белы хлеб і сырадой.
Нават, уздыхнуўшы цяжка,
Чалавеку у руку
"Хронік" Яшка
Сунуў пляшку
Самагону-першаку.
Каб зрабіць хоць чымсьці ласку,
Кожны ў свой запас залез.
Нагрузілі пад завязку
Той шыкоўны "Мерседэс".
Пачуваўся Чын прыўзнята:
Харчу мецьме — на вякі!
Бо з ягонаю зарплатай
Хоць падайся ў жабракі...*

* * *

*Нам жывецца не ў раскошы,
І народ мяркуе так:
Хто не лічыць сёння грошы?
Багацей або жабрак.*

НАРОДНЫЙ КОНТРОЛЬ



# Пейзаж бесхозности

Скажите, вы давно были в тайге? Ах, никогда не были?

Не отчаивайтесь, это упущение легко можно исправить. Для этого вовсе не обязательно лететь в Сибирь или, скажем, на Дальний Восток. Все гораздо проще и прозаичней. Достаточно в Минске сесть на электричку и ехать в направлении г.Столбцы до станции "Кучкуны". Далее переходите железную дорогу и через 50 метров вы — в непроходимой тайге.

Здесь есть все, чему положено быть в таких местах. Есть чащи, есть буреломы, есть настоящие завалы из сгнивших, полусгнивших и вполне еще здоровых деревьев. Правда, медведей не встречал, врать не буду. Но почему-то мне кажется, что они там обязательно заведутся.

И еще, там точно нет хозяина, даже не сомневайтесь.

Ежедневно с экрана телевизора, из радиоприемников, из других средств массовой информации мы слышим призывы эффективно использовать местные виды топлива и другие ресурсы.

Все прилагаемые фотографии я сделал практически рядом с дорогой, ничего специально не выбирая. И такой "пейзаж" занимает многие гектары. И не дает мне спокойно спать. А вам?

**Александр СТАНКЕВИЧ.**
**Минск.**

**P.S.** Кстати, ненамного лучше картинка и вблизи станций "Асино", "Мезиновка", "Колосово", "Отцеда".

АДНОЙЧЫ...

# Канцэрт для аднаго слухача

Днямі Ніл Сымонавіч Гілевіч адзначыў сваё 80-годдзе. Далучаючыся да шматлікіх віншаванняў, я хачу яшчэ падзяліцца некаторымі ўражаннямі.

Калі я, масквічка родам, апынулася ў Беларусі і сустрэлася тут з паэзіяй Ніла Гілевіча, адразу ж прыкіпела да яе душой. Стала вывучаць мову і завучваць яго вершы на памяць, чытаць са школьнай самадзейнай сцэны. А скончыўшы педінстытут і паехаўшы на вёску настаўніцай, ладзіла паэтычныя вечарыны ў школе і сельскім клубе, кіравала фальклорным гуртом "Спадчына". Ужо працуючы ў мінскай СШ №212, разам з вучнямі зладзілі праграму, прысвечаную чараўніку паэзіі.

Аднойчы набраліся мы з маімі гадаванцамі духу і адважыліся папрасіць паэта аб сустрэчы. І, о дзіва! — ён пагадзіўся, запрасіў сустрэцца ў Доме літаратара. Але... Калі прызначаны час прыйшоў, ашаламіла вестка: улады выкінулі беларускіх пісьменнікаў з іх дома!

Што рабіць? Мы вырашылі ўсё роўна прыйсці туды. Прыйшоў і Ніл Сымонавіч. У глядзельную залу ўжо не пускалі. Паўсюль грувасцілася вынесеная з пакояў мэбля. Усё ж у фае на другім паверсе самотна стаяла адно, яшчэ не выкінутае крэсла. Уладкавалі ў ім паэта, атачылі яго з усіх бакоў. І... доўгачаканае свята адбылося!

Мы былі шчаслівыя гаварыць з любімым творцам. Радаваліся яму, а ён усміхаўся нам, распавядаў пра сваё маленства і юнацтва, перасыпаючы расповед гумарам, жартамі. Наша ніякаватасць — як жа сябе трымаць побач з такім чалавекам? — хутка растала, і ўсе пачуваліся як роўныя з роўным. Задавалі мудраму і сардэчнаму субяседніку мноства пытанняў, і на ўсе чулі грунтоўныя і даходлівыя адказы. Ніл Сымонавіч у сваю чаргу шчыра цікавіўся, як вучацца дзеці, чым захапляюцца, да чаго імкнуцца, якія ў іх мары і ці любяць яны родную мову настолькі, каб прайсці з ёю па жыцці.

Завяршылася цікавая гутарка маленькім канцэртам, які мы падрыхтавалі ў дарунак Нілу Сымонавічу. З любасцю чыталі яго вершы і маглі рабіць гэта бясконца. Але з-за дзвярэй суседняга кабінета раз-пораз высоўвалася галава нейкай "важнай асобы" — пэўна, з новых уладальнікаў Дома літаратара, строга абрываючы нас на паўслове: "Хватит! Не мешайте работать!" Быццам "строгае папярэджанне" можа зачыніць высокай паэзіі доступ у чуйныя сэрцы тых, каму яна прызначана і дзеля каго створана. Не дзеля глухіх жа і сляпых...

На тым незабыўным канцэрце для аднаго слухача я прачытала свой, прысвечаны вялікаму патрыёту Бацькаўшчыны верш, радкамі якога хачу звярнуцца да шаноўнага юбіляра і сёння:

*Здаецца мне,
што разумею боль,
Які Вам не дае штодзень спакою.
За мову нашу і культуру ў бой,
Гатовых з Вамі разам,
нас — даволі!*

**Вера БУЛАНДА,**
**настаўніца.**
*Мінск.*

ВАС ЦІКАВІЦЬ

## Фотасафары ў Белавежскай пушчы

*Чула, што быццам бы Нацыянальны парк "Белавежская пушча" прапануе новую паслугу для турыстаў — фотасафары. Цікава, колькі каштуе такая вандроўка і для каго яна арганізавана?*

***Алесь, Мінск.***

Праект "Фотасафары" стартаваў у Белавежскай пушчы зусім нядаўна. З гэтага часу любы турыст, узброіўшыся камерай, можа правесці фотапаляванне на пушчанскіх жывёл.

Кошт паслугі — 398,8 тыс. рублёў. У распараджэнні фотапаляўнічага 8 гадзін, якія пры жаданні можна падзяліць на некалькі перыядаў: спазнаць таямніцы пушчанскай дзікай прыроды прапануецца на аўтамабілі ў суправаджэнні спецыяліста парку.

Першым у фотасафары па Белавежскай пушчы адправіўся госць з Масквы, паведамляе belta.by. Ён фатаграфаваў зуброў.

НЕ МАГУ МАЎЧАЦЬ

# Вар'яты

Людзі добрай волі і здаровага разважання, звярніце сваю ўвагу, што дзеецца ў нашай Беларусі! Нядаўна прачытаў у газеце "Народная Воля", што ў Беларусі яшчэ не перавяліся вар'яты, якія збіраюць грошы на пабудову помніка Сталіну.

Увесь свет ведае, што рабіў Сталін. Заключыў мір і дружбу з Гітлерам у 1939 годзе. Правёў рэпрэсіі супраць каманднага саставу Савецкай Арміі — ад лейтэнантаў да генералаў, пад якія падпалі ў агульнай колькасці дзясяткі тысяч чалавек. Гэтым ён аслабіў баявітасць Савецкай Арміі, і каб не маразы, то немцы і Маскву маглі захапіць. Толькі ў палон трапіла 4,5 млн савецкіх салдат. Вось такія "заслугі" Сталіна. А колькі тысяч нявінных людзей грамадзянскіх прафесій было расстраляна!

У 1930—1933 гадах ва Украіне ў сувязі з арганізацыяй калгасаў і прадразвёрсткай у сялян забіралі ўсё зерне, у выніку чаго адбыўся голад, так званы "галадамор", і тры мільёны чалавек памерлі. Былі здарэнні, што людзі елі сваіх дзяцей, каб выжыць астатнім.

І гэта — Сталін. Кажуць, пасля галадамору стала лягчэй, бо на трудадзень людзі атрымлівалі плату 200 грамаў зерня. Але што такое 200 грамаў? Гэта 3—4 галубы з'ядуць за адзін раз. Сяляне перабіваліся то грыбамі, то ягадамі, то лебядой.

Усе сядзелі ў турмах. Людзей судзілі так званыя "тройкі", расстрэльвалі толькі за тое, што чалавек сказаў нядобрае слова пра Сталіна. Жыццё чалавека каштавала столькі ж, колькі жыццё мухі. Але наша ўлада дазваляе легальна гэтым вар'ятам збіраць грошы на помнік Сталіну — забойцу сваіх суграмадзян. Каб на такое адважыліся неафашысты ў Германіі — збіраць грошы на помнік Гітлеру, ды тут жа апынуліся б у турме. А ў Беларусі — гэта можна. Суайчыннікі, адгукніцеся на маю заметку!

**Міхась КРЫЛОВІЧ.**
*г.Мінск.*

БОЛЬ

# Как меня трижды кинуло государство

Мне 74 года, и в этом возрасте нечему удивляться, ибо много пришлось повидать и пережить. Но то, что творится в настоящее время, заставило меня взяться за ручку и излить наболевшее на страницах "Народной Воли".

К моменту развала Советского Союза я имел в запасе 3-процентные облигации на сумму 12 тысяч рублей, и у моей мамы их было на сумму 3 тысячи рублей. Работая инженером-конструктором, определенную сумму из своего скромного оклада я выделял на приобретение этих облигаций для последующей покупки автомобиля. Иногда мне везло — выпадали кое-какие выигрыши.

Я стал в очередь в магазине и ожидал наступления счастливого момента, когда я стану обладателем "Жигулей" либо "Запорожца". Нужно было постоянно успевать за ростом цен на автомобили, но я не отчаивался и пытался угнаться за ними.

В СССР авто считался предметом роскоши. Очереди в магазинах ликвидировали. Автомобили стали распределять по предприятиям и организациям. Для того чтобы профком или завком выделили тебе машину, необходимо было иметь какие-либо заслуги перед государством или быть ветераном войны. Моя мама в свое время была награждена медалью за доблестный труд в Великую Отечественную войну. Отец пропал без вести в блокадном Ленинграде в 1942 году. Он работал инженером на военном предприятии и имел бронь и поэтому не был призван на фронт. Я имел несколько изобретений и считался неплохим конструктором. Но все это не являлось достаточным аргументом для выделения автомобиля. На рынке подержанный автомобиль покупать по двойной цене я не хотел, да и таких средств у меня не было. Так и остался я с этими облигациями до распада СССР.

После распада СССР выплаты по 3-процентным облигациям заморозились в России на год, а в Беларуси на два года. Через год в России я сумел избавиться от этих облигаций, и за полученные деньги приобрел турецкую кожаную куртку. В общем, полностью лишился средств, заработанных при строительстве развитого социализма и коммунизма.

После достижения пенсионного возраста я вновь решил создать себе материальную подушку безопасности. Обладая в 60 лет неплохим здоровьем, подался в индивидуальные предприниматели. На протяжении 12 лет скопил кое-какое состояние, которое держал периодически то в валюте, то в белорусских рублях на банковских депозитах.

До 2008 года по заявлению героя Беларуси, а именно председателя правления Нацбанка РБ П.П.Прокоповича и президента А.Г.Лукашенко, курс белорусского рубля постоянно укреплялся. Экономические показатели росли. Кредитно-денежная система находилась в хорошем состоянии, а золотовалютные резервы увеличивались. Но потом началась плавная девальвация белорусского рубля, закончившаяся 1 января 2009 года 20-процентной его девальвацией. Как раз перед тем Новым годом (2009-м) я оказался в отделении кардиологии Больницы скорой помощи, а проснувшись 1 января обнаружил, что потерял 7000 долларов. Немного расстроился, что не прислушался к предсказаниям наших "свядомых из 5-й колонны", что верил власти и не перевел свой 51 млн белорусских рублей в иностранную валюту и продолжил держать эту сумму на депозите, так как банки давали хорошие проценты по вкладам в белорусских рублях. Вот и получил.

Время шло, нас опять продолжали уверять в преимуществах белорусской экономической модели и невиданном росте ВВП, рассказывали, что мы самые счастливые люди на постсоветском пространстве. У нас самое социально-ориентированное государство в мире, а из белорусской экономической модели кое-какие государства что-то заимствуют. Цены на продукты питания и товары росли, а у нас повышался жизненный уровень.

Президент государства издал указ по защите вкладов населения в банках. А, находясь в Борисове, заявил, что никакой девальвации белорусского рубля он не допустит. И что слухи о новой девальвации опять распускаются нашими "свядомымі"...

Да и глава Нацбанка Прокопович заявил: "Пока я являюсь председателем Нацбанка, никакой одномоментной девальвации не будет". Ну как было всем этим заверениям не верить?!

Однако жизнь показала правоту наших "свядомых" и независимых аналитиков о неизбежности очередной девальвации белорусского рубля, доказала, что заявления руководителей государства были сделаны только для успокоения населения, чтобы народ не кинулся в банки снимать свои сбережения.

Время шло, курс белорусского рубля продолжал падать, правительство и Нацбанк не принимали никаких мер по стабилизации обстановки. А потом одномоментно банки прекратили операции по конвертации белорусского рубля, в обменных пунктах исчезла валюта, а продажа драгметаллов начала осуществляться только за валюту. Очевидно, власти испугались, что белорусы могут скупить все золото, находящееся в хранилищах Нацбанка.

Подошла дата 23.05.2011 года, и президент на совещании с участием членов правительства и Нацбанка объявил об очередной девальвации белорусского рубля на 56%. На этот момент у меня на депозите находился 31млн рублей, и легко подсчитать, что меня обворовали на 3783 доллара.

Нынешний глава Нацбанка Надежда Ермакова заявила, что белорусам не нужны доллары и что у нее лично их нет. Так, может, Ермакова хранит свои сбережения в драгметаллах??? За год золото подорожало на 50%, но, к сожалению, я поздно это понял, Надежда Андреевна, видимо, оказалась умнее.

Особо хочу остановиться на совещании президента 30 августа 2011 года. Я слушал его выступление и при некоторых моментах меня охватывал смех. Ну разве не смешно слышать: "Мы не должны допустить снижения жизненного уровня населения". Да при таком жизненном уровне скоро рабочие при нынешних ценах и зарплатах не в состоянии будут стоять за станками. О каком демографическом росте населения можно говорить, если детские памперсы стоят 72 тыс. рублей за 32 штуки, а их хватает в лучшем случае на 10 дней. Если моющие средства подорожали в 3 раза?

С 16 августа по 24 августа 2011 года я опять находился в кардиологическом отделении Больницы скорой помощи. Питание в больницах оставляет впечатление такое, будто по синеокой Беларуси только что прошла война. И это при росте ВВП на 10—12%!!!

Я, как и многие белорусы, не просили президента о выходе на равновесный курс доллара. Его могли просить только состоятельные люди, хранящие деньги в валюте, для которых он обещал амнистию капитала. Мы, простые вкладчики, попросили бы президента проиндексировать наши вклады. Население дало государству в пользование свои денежные средства и имело гарантии президента в сохранности этих денег. А нас государство не единожды кинуло. Так что это будет справедливо.

**Борис Давидович РАЙЦИН,**
*Минск.*

ЗАЧАПІЛА

## Мо без вас было б лягчэй?

Акадэмік і старшыня Савета Рэспублікі чыстасардэчна прызнаўся, што "нічога талковага сказаць не можа". Калі ён нічога талковага не можа сказаць, то што тады ён можа талковае зрабіць для беларускага народа? Што ведае сенатар Рубінаў? Колькі грошай атрымлівае Рубінаў за "працу" ў сенаце, ён не ведае. Яго не цікавіць кошт мяса, малака, хлеба... Цану на бензін ён не ведае, бо за яго разлічваецца жонка. Вось такія асобы кіруюць дзяржавай!

Колькі ні гадаў, колькі ні ламаў галаву, каб знайсці адказ на пытанне, чаму мы, беларусы, жывём усё горш і горш, адказу не знаходзіў. І тут раптам акадэмік Рубінаў мне яскрава патлумачыў. Аказваецца, уся справа ў тым, хто ў руля дзяржавы. Відаць, рубінавы захапілі ўладу ў свае рукі, каб самім вальготна жыць, каб задаволіць уласныя амбіцыі ды пакрасавацца ў крэслах кіраўнікоў. Колькі ж рубінавых сядзіць ва ўладных кабінетах! Яны ёсць у розных міністэрствах, аблвыканкамах і райвыканкамах. Вось і дакіраваліся, што пенсія пенсіянера-настаўніка "скукожылася" да 80—90 долараў. Вось даць бы Рубінаву за сенатарскую пасаду такія грошы, як атрымлівае настаўнік у вёсцы, дык ён бы хутка зведаў цэны на ўсе харчовыя тавары.

Як былы настаўнік, хачу даць дамашняе заданне прэзідэнту. Аляксандр Рыгоравіч, збярыце ўсіх рубінавых ды правядзіце не толькі па сталічных гастраномах, але звазіце ў Ганцавічы і Слуцк, Столін і Салігорск, Жлобін і Петрыкаў, няхай паглядзяць на цэннікі. Пры гэтым хоць на адзін месяц дайце ім зарплату ў 80—100 долараў. Ды каб яны паехалі не на службовых "лімузінах", а на маршрутным транспарце. Вось тады сп.Рубінаў зведаў бы цану бензіну, якая так часта расце, што не паспяваеш сачыць за яе зменай.

Ці не пара ўсім рубінавым пакінуць кіруючыя крэслы і кабінеты? Можа, без вас стала б лепей жыць? Як сказаў вялікі наш сатырык: "Мо без вас было б лягчэй? Паспрабуйце злезці".

**Уладзімір ГУК,**
**пенсіянер.**
*Пінскі раён.*

НАБОЛЕЛО

## Получается, что нам дают милостыню

Добрый день, уважаемая редакция!

Может быть, мое письмо ничего существенного мне не принесет, но очень хочется рассказать, как "счастливы" пенсионеры.

Мы приехали в Беларусь из Украины в 2000 году, пока имеем вид на жительство. Правильно сделали или нет, говорить уже поздно. Здесь наш дом, здесь наши дети.

Выдаткаў, між іншым, хапае. Трэба не толькі выплаціць прэміі, стварыць дыпломы і арганізаваць конкурс, а яшчэ і разлічыцца са спецыялістамі, якія будуць ацэньваць фестывальную праграму. Пра журы ўвогуле варта сказаць некалькі асобных слоў. У ЗША існуе прэмія нацыянальнай кінаакадэміі, а ў Беларусі з гэтага года вырашаць, хто стане лаўрэатам Нацыянальнай тэатральнай прэміі, будзе новаствораная Беларуская тэатральная акадэмія. У яе склад увайшлі 112 чалавек: крытыкі, акцёры, рэжысёры і іншыя людзі, напрамую датычныя да тэатральных спраў. Менавіта яны вырашаць, хто з намінантаў варты высокіх узнагарод. Рашэнне прымалася проста — чым больш людзей будуць раіцца і выбіраць, тым менш верагоднасці суб'ектыўнага выбару. А значыць, пераможа насамрэч мацнейшы.

### Старыя знаёмыя

Усяго за права стаць лаўрэатамі Першай Нацыянальнай тэатральнай прэміі змагаюцца 12 пастановак сталічных і рэгіянальных тэатраў. Інтрыга спаборніцтва будзе раскрыта 10 кастрычніка, калі падчас урачыстай цырымоніі закрыцця вядучыя назавуць пераможцаў. Цікава, але адкрыццё фестывальнай часткі будзе даволі сціплым, а вось падвядзенне вынікаў аформяць з помпай. Нават пра чырвоны дыванок для зорак не забудуцца, прызнаўся Павел Латушка.

Надаць шыку і бляску ганароваму ўручэнню ўзнагарод зможа і вядучая вечара — актрыса **Святлана Зелянкоўская**. Новая роля спадарожніцы жыцця лідара гурта "Ляпіс Трубяцкой" **Сяргея Міхалка**, безумоўна, стала нечаканай для многіх.

Што тычыцца сюрпрызаў на ўзнагароджанні, то яны абавязкова будуць. Так, дагэтуль невядома, які сімвал перамогі атрымаюць лаўрэаты прэміі.

### Прабачце-пасуньцеся...

Новая Нацыянальная тэатральная прэмія рыхтуецца з размахам. Варта заўважыць, што да адбору было пададзена 27 заявак. Грандыёзная лічба, калі ўлічыць, што ў краіне толькі 28 дзяржаўных тэатраў. Ажыятаж у сувязі з новай прэміяй зашкальвае. Ці не выцісне новы конкурс старыя прафесійныя спаборніцтвы з жыцця беларускіх тэатраў?

*"Пры ўсёй павазе да тэатральнай прэміі Беларускага саюза тэатральных дзеячаў "Хрустальная Паўлінка" — гэта вельмі карпаратыўная ўзнагарода,* — адзначыў рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў **Рычард Смольскі**. — *Новая прэмія — сведчанне ўвагі дзяржавы да тэатра"*.

Тэатральны фестываль "Белая Вежа" ўвогуле атрымаў ад Смольскага разгромную ацэнку. Мастацтвазнаўца так раскрывакаваў працу журы конкурсу, што стала ясна, якая прэмія ў дзяржаўнай пашане.

Праўда, арганізатары ўжо атрымалі незадаволеныя каментары ад экспертаў-журналістаў. Маўляў, не ўсе пастаноўкі вартыя таго, каб увайсці ў фінал спаборніцтва. На гэтыя словы міністр культуры толькі параіў "*не судзіць строга*", бо ўсё толькі пачынаецца.

ДАВЕДКА

### Каго судзім?

*У фінал Нацыянальнай тэатральнай прэміі Беларусі журы вылучыла 12 спектакляў з усёй краіны. Галоўны крытэрый адбору — цікавасць сезоннай прэм'еры.*

Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета прадставіць оперу "Набука" Джузэпэ Вердзі, п'есу "Не мой" Алены Калюнавай і Аляксандра Гарцуева па матывах аповесці Алеся Адамовіча "Нямко" на конкурсе пакажа Нацыянальны акадэмічны тэатра імя Янкі Купалы, п'еса "Сонечка" Алены Паповай па матывах рамана Фёдара Дастаеўскага "Злачынства і пакаранне" пакажа Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі, пазнаёміцца з "Квартэтам" Рональда Харвуда дазволіць Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа, гледачы ўбачаць п'есу "Эсфір" па п'есе Людмілы Уліцкай "Мой унук Веніямін" у выкананні акцёраў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Максіма Горкага, экзатычную пастаноўку "Аршын мал алан" Узеіра Гаджыбекава прэзентуе Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр, спектакль "Драй швестерн" па матывах драмы Антона Чэхава "Тры сястры" прадставіць Беларускі дзяржаўны тэатр лялек, Драматычны тэатр Беларускай арміі зробіць акцэнт на класіку, паказаўшы "Сабаку на сене" Лопе дэ Вэга, "Магічнае люстэрка Твардоўскага" Сяргея Кавалёва можна будзе пабачыць у пастаноўцы Гродзенскага абласнога тэатра лялек, "Хросная маці" Максіма Горкага па п'есе "Васа Жалязнова" будзе візітоўкай Гомельскага абласнога драматычнага тэатра, п'есу "№13" Рэя Куні сыграюць акцёры Тэатра-студыі кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм", спектакль "Тарэлкін" Аляксандра Сухава-Кабыліна пакажа Магілёўскі абласны драматычны тэатр.

ТЫМ ЧАСАМ

### Колькі краіне патрэбна тэатраў?

*Міністр культуры Беларусі Павел Латушка назваў інфармацыю аб тым, што па ягонай ініцыятыве ў Гомелі будзе ўзведзены другі тэатр оперы і балета, надта перабольшанай.*

На гэтым тыдні інфармагенцтвы распаўсюдзілі паведамленне аб тым, што міністр культуры Беларусі заявіў аб хуткім будаўніцтве ў Гомелі новага тэатра оперы і балета. Маўляў, Гомель — другі па велічыні горад у краіне, ды і шматлікія выбітныя оперныя спевакі паходзяць менавіта з гэтага месца.

Яго няправільна зразумелі.

"*Зараз толькі разглядаецца варыянт пабудовы ў Гомелі тэатра оперы і балета,* — выказаўся міністр. — *Асабіста я лічу, што адзін оперны тэатр для краіны — мала. Ідэя цудоўная, але пакуль будаўніцтва толькі ў плане. Таксама мы абмяркоўваем варыянт узвядзення драматычных тэатраў у Лідзе і Полацку"*.

**Марыя МАЛЕВІЧ.**

ФЕСТЫВАЛІ

## Чайкоўскі пад купалам цырка

*Адкрыццё VI Міжнароднага фестывалю Юрыя Башмета ў Мінску адбылося ў незвычайным для акадэмічнай музыкі месцы — будынку Беларускага цырка.*

Спецыяльна для гэтай фестывальнай уверцюры быў абраны і рэпертуар: творы Глінкі, Берліёза і Чайкоўскага прагучалі ў спалучэнні з выступленнямі артыстаў цырка.

Цыркавая арэна для Юрыя Башмета, як ён патлумачыў на прэс-канферэнцыі, не з'яўляецца чымсьці новым. Некалі ў Пензе яму давялося іграць у памяшканні мясцовага цырка. Як прызнаўся маэстра, тое выступленне суправаджалася слязьмі ўдзельнікаў аркестра. Прычынай быў неверагодна моцны пах. Тым не менш прапанову адкрыць фестываль у Мінскім цырку Башмет прыняў з ахвотай. Па-першае, таму, што цалкам давярае арганізатарам фестывалю з беларускага боку; па-другое, ён наогул любіць выступаць у незвычайных для акадэмічнай музыкі месцах.

Юрый Абрамавіч прызнаўся, што прыязджаць у Мінск яму заўсёды прыемна і цягам шасці гадоў тут склалася зладжаная каманда людзей, якія з ахвотай працуюць на фестываль.

У сёлетняй яго праграме, як, дарэчы, і заўсёды, значацца некалькі ўдарных момантаў. Гэта канцэрты лаўрэата прэміі "Грэмі" камернага ансамбля "Солисты Москвы", адзін з якіх адбудзецца ў Магілёве. 6 кастрычніка ў зале Белдзяржфілармоніі адбудзецца прэм'ера твора для цымбалаў з аркестрам, які быў спецыяльна напісаны да фестывалю маладым беларускім кампазітарам Канстанцінам Яськовым. Закрыецца фестываль 10 кастрычніка ў Палацы спорту канцэртам "Класіка сустракае рок", падчас якога на адной сцэне сустрэнуцца Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Аляксандра Анісімава і ўкраінская рок-група "Океан Ельзи". Цягам фестывальнага тыдня пройдзе ўжо трэцяя па ліку Маладзёжная музычная акадэмія краін СНД пад кіраўніцтвам Юрыя Башмета, які падчас прэс-канферэнцыі не раз падкрэсліваў добрую падтрымку фестывалю з боку ўлады, у тым ліку і прэзідэнта. Праўда, той у дзень адкрыцця фестывалю ў цырку так і не з'явіўся, абраўшы іншы жанр — "Дажынкі"...

**Дзмітрый ПАДБЯРЭЗСКІ.**

## «Гаворым па-беларуску»

*Напрыканцы кастрычніка тэлеканал "8 канал" прадставіць праект "Гаворым па-беларуску", паведаміў генеральны дырэктар ЗАТ "8 канал"* ***Пётр Чарнаморац****.*

Паводле яго слоў, на працягу тыдня ў эфіры тэлеканала будуць паказаны 12 фільмаў еўрапейскіх рэжысёраў на беларускай мове.

Карціны перакладзены і агучаны "8 каналам". У іх ліку серыял "Агнём і мячом", фільмы "Вяселле", "Новыя амазонкі", "Мішкі" і іншыя.

Мэта праекта — падтрымаць беларускую мову.

## На белорусскую Неделю моды едут дизайнеры из Нигерии и Франции

*С 19 по 24 октября в Минске пройдёт Неделя моды Belarus Fashion Week.*

Как сообщает сайт проекта, на подиуме BFW будут представлены ведущие белорусские дизайнеры с коллекциями "Весна—Лето 2012": BOITSIK, Efremova&Haridovets, TARAKANOVA, RADA-style, Tanya Arzhanova, O.Jen, IVAN AIPLATOV, LUDMILA LABKOVA, BRAVO-bel, ULIA LATUSHKINA, DAVIDOVA, KUCHERENKO, TSOKALENKO, Natasha Tsuran и другие.

Специальными гостями станут дизайнеры из России, Украины, Польши, Литвы, Франции и даже Нигерии.

Во время недели моды в Минске будут организованы серия вечеринок в клубах города, официальные приемы, пресс-коктейль, открытие фотовыставки и др. Над образами моделей каждого из показов будет работать мастерская имиджа и художественного образования "L`Atelier De L`image" **Татьяны Анюковой**.

**Полина ПЛАТОНОВА.**

## Миллионным абонентом byfly стала семья из Молодечно

*В подарок удачливые пользователи получили миллион минут бесплатного интернета.*

Житель Молодечно **Георгий Вайтеховский** выиграл неожиданный подарок от РУП "Белтелеком". Мужчина и представить не мог, что подключая услуги интернет byfly, он станет юбилейным пользователем.

Дабы подчеркнуть торжественность события, чествовать мужчину и всю его семью приехал сам министр связи и информатизации **Николай Пантелей**. Сопровождали важного чиновника генеральный директор РУП "Белтелеком" **Сергей Попков**, директор Минского филиала **Юрий Петрученя**, начальник Молодечненского РУЭС **Константин Ратомский** и заместитель председателя райисполкома города Молодечно **Юрий Байтаз**.

Семья Вайтеховских смогла не только "поручкаться" с сильными мира информации Беларуси, но и получить приятный подарок. Сертификат на бесплатное пользование пакетом "Оптимум" в течение целого миллиона минут от byfly Пантелей вручил самому юному члену семьи — миллионному абоненту.

**Мария МАЛЕВИЧ.**

ЦИТАТНИК

## Анжелика АГУРБАШ: «Мне небезразлично, что мои друзья в Минске не могут купить даже свежую курицу в магазине...»

*Не так давно заслуженная артистка Беларуси ответила на вопросы ежедневной российской электронной газеты "Утро.ру". Не обошлось и без вопросов о политике...*



**— Как вы реагируете на то, что сейчас происходит на вашей родине — в Беларуси? Нужны ли перемены и кто виноват в сложившейся ситуации?**

— В Беларуси живет огромное количество моих близких людей, друзей, поклонников, — ответила артистка. — Мне, конечно, небезразлично то, что происходит сейчас. Например, мне небезразлично, что мои друзья не могут купить даже свежую курицу в магазине. Перемены нужны всегда, всем и всюду. Кто виноват? Я не знаю, я же не политический деятель. Сейчас я бываю в Беларуси редко, поэтому мне сложно комментировать эту ситуацию. Нужно разбираться серьезно, чтобы давать серьезные ответы...

**— Из Беларуси приходят самые различные отзывы о Лукашенко. Как вы лично оцениваете жизнь в стране и политику президента?**

— Я не могу дать оценку сложившейся ситуации, время и жизнь покажут и расставят все по своим местам...

АСОБА

# Чыстае паветра Аляксея Шадзько

*З'ехаўшы на працу ў Маскву, акцёр і музыка Аляксей Шадзько тым не менш выдае чарговы альбом на радзіме. Прэзентацыя запланавана на 10 кастрычніка. Напярэдадні Аляксей падзяліўся з "Народнай Воляй" сваімі назіраннямі не толькі пра Маскву.*



### «Лужкова знялі, аднак нічога не змянілася»

— Альбом *"Только бы не было холодно"*— першы пасля 2007 года. Выданне альбома для мяне — сапраўднае свята. Мне не ўсе свае папярэднія альбомы падабаюцца цалкам, і я вельмі хачу, каб гэты спадабаўся ўсім.

**— Які настрой у альбома?**

— Галоўнае, ён не злы. У ім шмат пазітыву, у мяне атрымалася выказаць свае думкі. На самым пачатку мы запісалі песню, якая называецца "Москва". Нехта можа падумаць, быццам я вырашыў напісаць песню з такой назвай, каб прапіярыць сябе там, паколькі такога роду песень пра Маскву практычна няма. Я зусім не думаў напісаць новы гімн Маскве, мне проста аднойчы стала крыўдна, што Масква — горад мне далёка не чужы — цяпер зрабілася горадам, які нічога агульнага не мае з тым, чаго мне асабіста хацелася б. Масква, па сутнасці, цяпер руйнуецца ва ўсіх сэнсах: у плане архітэктуры, камунікацый, духоўна. Каштоўнага там засталося мала. Лужкова знялі, аднак нічога не змянілася. Дух Масквы ў межах Садовага кальца, на жаль, знікае. Таму і з'явілася такая песня. І мне напачатку падавалася, што ўвесь альбом будзе падпарадкаваны гэтай тэме. Аднак потым былі новыя песні, тэма Масквы пайшла ў пясок, і пасля я напісаў песню, якая называецца "Только бы не было холодно".

**— Зіму меў на ўвазе?**

— Не, яна сваім сэнсам проста аб'яднала ўвесь матэрыял. Сэнс самой песні, усяго альбома нельга разумець літаральна. Што б ні адбывалася з чалавекам, у якія б сітуацыі ён ні трапляў, — нічога не можа параўнацца з тым, калі яму холадна. Калі табе робіцца холадна — гэта ўжо сапраўдная бяда.

**— Будзеш здымаць кліп на адну з песень?**

— Мне вельмі хочацца зняць кліп на першую песню з альбома, якая называецца "Мне не хватает... температуры" *(смяецца).*

**— Як ты ставішся да таго, што твае песні трапляюць у інтэрнэт, дзе іх можна бясплатна ўзяць**?

— Нармальна. Аднак я асабіста ніколі нічога не пампую з інтэрнэта. Якасць не надта добрая. Таму куплю ліцэнзійныя альбомы. Мне падабаецца трымаць у руках сапраўдную кнігу, а не чытаць з дапамогай нейкага электроннага прыстасавання. Для мяне гэта вельмі істотна. Усе з майго атачэння, людзі дарослыя, трымаюцца гэткіх жа поглядаў. Яны купляюць дыскі, ставяць іх на палічкі. Слухаць музыку можна ў машыне, але лепш дома. Не будзеш жа крочыць з відэамагнітафонам па вуліцы і глядзець спектакль МХАТа. Тое ж датычыць і музыкі, для якой павінна быць сваё месца.

### «Нават Анжаліка Агурбаш выступае ў дастаткова вялікіх залах»

**— Ці даваў ты ўжо канцэрты ў Маскве?**

— У музычных колах мяне там мала хто ведае. І таму ніякіх прапаноў выступіць не было. Сам жа я гэтым не займаюся, таму што вельмі заняты ў тэатры. А што такое канцэрты ў Маскве? Прыкладам, там дастаткова часта ў вялікіх залах выступаюць такія спевакі, як Рыгор Лепс, Валерыя, Аніта Цой, мною вельмі паважаны Мікалай Наскоў (але ён, дарэчы, у Маскве дае канцэрты ў вялікіх залах не часцей за раз на год-два, калі не радзей). Нават Анжаліка Агурбаш выступае ў дастаткова вялікіх залах. Але збольшага канцэрты адбываюцца ў клубах. І ў кожным маецца нейкая свая кампанія выканаўцаў. Калі я толькі пераехаў у Маскву і, зусім наіўны, пайшоў у гэтыя клубы ў спадзяванні там выступіць, дык сустрэў вельмі дзіўную для мяне рэакцыю. Паказваў свой матэрыял, тлумачыў, што і як. А мне адказвалі: вы ж не будзеце ў нас штодня выступаць, вы раз на тыдні выступіце, а пасля вас да нас ніхто не прыйдзе. І гэта праўда, чэснае слова! Ім проста такая музыка не патрэбна! Як мне сказалі: ім патрэбны губны гармонік, каўбойскія боты і блюз. Прычым тыя боты да блюзу?

**— І ты перастаў прасіцца?**

— Я зразумеў: мой шлях сам павінен адшукаць мяне. Хадзіць і прасіцца стала нецікава. У Маскве з музыкай амаль тое ж самае, што і з тэатрам. Калі ты аднойчы пакажашся вельмі добра, дык цябе проста закрыюць. Таму неабходны нейкія нябёсныя сілы, каб цябе падтрымалі. Праўда, тэатральнае жыццё крыху адрозніваецца ад музычнага хоць бы тым, што там прыстойных людзей больш. А мне найперш патрэбна тое, каб была цікавая праца. Бывае, звоняць з нейкай кампаніі, якая здымае серыялы, і надзвычай здзіўляюцца, калі я прашу даць магчымасць азнаёміцца са сцэнарыем. Ці кажуць: "Вы будзеце здымацца з такім вось акцёрам". А я пытаюся: "Хто гэта?" І яны зноў вельмі здзіўляюцца.

Канешне, мне вельмі хацелася б пашырыць музычную дзейнасць. І не толькі ў Маскве. Але пры гэтым на радыёстанцыях мне кажуць: нефармат. Дык, значыць, ён — г...но, мяняйце фармат! Чаму я павінен ганяцца за вашым фарматам?! Якога хрэна? Дык і сядзіце ў сваім фармаце.

### «Жыццё ў Маскве вельмі няпростае...»

**— Ці лёгка прыняла цябе Масква?**

— Знайсці працу там лёгка, была б галава, амбіцыі і дыплом сапраўдны, а не куплены ў пераходзе. Аднак жыццё там вельмі няпростае. Не раю туды імкнуцца. Шчыра кажучы, я і сам не хацеў пераязджаць у Маскву, але так склаўся лёс, на жаль. Я ж займаюся толькі тым, што ўмею. Тое, што я добры акцёр, ведае ўвесь МХАТ. Мне вельмі падабаецца той дух, які жыве ў гэтым тэатры.

**— Дык што ж цябе прымусіла пакінуць мінскі тэатр? Гісторыя з Паўлам Харланчуком, твой вядомы адкрыты ліст?**

— Не-не, не гэта! Я тады сур'ёзна траўміраваўся. Калі б не гэта, я нікуды не паехаў бы, бо быў сур'ёзна заняты ў рэпертуары. Але ў Маскву пераехала сям'я. Там больш выгадна жыць.

**— У якіх ролях ты цяпер заняты?**

— 1 кастрычніка адбылася прэм'ера "Не всё коту масленица" Астроўскага. Я выконваю ролю Ахава, ішоў да яе шмат часу. Больш сур'ёзных роляў не бывае! Яшчэ выконваю ролі герцага Веронскага, старшыні калгаса ў спектаклі "Деньги для Марии" паводле Валянціна Распуціна, дзядулі ў славутым спектаклі МХАТа "Синяя птица", заняты ў "Школе злословия" Шэрыдана, "Прощание в июне" Вампілава і г.д. Аднак, па вялікім рахунку, мяне ў Маскве не ведаюць ні як акцёра, ні як музыканта.

### «Лёха, гэта рай!»

— Цяпер мы жывём там: я, мая жонка, дзве дачкі і сын жонкі ад першага шлюбу. Кватэру набылі ў крэдыт. Адначасова маю жыллё ў Ждановічах, кватэру ў Серабранцы, якая засталася ад бабулі. Мне ў Ждановічах пасля Масквы вельмі падабаецца, хоць наш тэатр дае магчымасць акцёрам здымаць летам дачы. І вось у той Салтыкоўцы, калі не зазіраць за плот, цалкам няблага. Але як толькі крокдругі па-за плотам — абавязкова трапіш у г...но. Там настолькі ўсё загаджана, што ў радыусе 300 кіламетраў вакол Масквы — суцэльны сметнік. Сусед па Салтыкоўцы запрасіў на рыбалку. Паехалі на веласіпедах. Я адной рукой руль трымаў, другой нос затыкаў. Ён казаў: возера. Я ўбачыў лужыну, у якой плавалі бутэлькі. А тут яшчэ з кустоў выпаўзла нешта падобнае на жанчыну: "Дай цыгарэту". Гэта а шостай раніцы! І вось што ўражвае: тыя, што там жывуць, проста звыкліся са смеццем. Не звяртаюць на яго ўвагі. І калі адзін мой сябра прыехаў сюды, у Ждановічы, і мы таксама на веласіпедах паехалі на Мінскае мора, ён увесь час паўтараў: "Лёха, гэта рай!"

**— Смецце — адзінае, што цябе ўразіла?**

— Не. Я абсалютна не разумею, чаму настолькі папулярны так званы рускі шансон. У мяне такое адчуванне, быццам я з Месяца зваліўся. Гэта я з нагоды Стаса Міхайлава кажу. Проста блатняк нейкі! І Ваенга мне не падабаецца, нават як жанчына. І кошты білетаў на такіх выканаўцаў. 18 тысяч рублёў, а?! Я бываў у Лондане, дык там кошт білетаў на канцэрт якой вядомай рок-групы не перавышае 40 фунтаў. Бо інакш ніхто не пойдзе. І калі білеты разыходзяцца дрэнна, іх пачынаюць прадаваць за паўцаны. А вось у адносінах да тэатра там нават закон існуе: кошт білета не можа перавышаць 45 фунтаў. Дзяржава дбае пра тое, каб усе грамадзяне маглі дазволіць сабе паглядзець спектакль. Тым часам кошт білетаў на спектаклі МХАТа часам сягае 2500 рублёў, ледзь не 100 долараў! Я лічу гэта агідным.

**— Тэатры змушаныя выжываць...**

— Але ж трэба нешта рабіць, каб мастацтва не падмянялі якія "Уральские пельмени". Я згодны, гэта смешна, але на сцэну ўсё часцей трапляе тое, што люмпенізуе людзей. І дзяржаву гэта не хвалюе. Па ўсіх каналах, у найлепшы час — суцэльныя "Уральские пельмени"! Ці серыялы кшталту "Воронины". Мая дачка з крыкам "Воронины" кідалася да тэлевізара. Дык я наогул забараніў ёй глядзець тэлевізар. І ў выніку, калі прызджае віяланчэльны квартэт, які збіраў Растраповіч, зала кансерваторыі запаўняецца ледзь напалову. Вось тая частка, за якую Маскву не люблю. Адна з тых частак...

**— Аднак яна па-ранейшаму прыцягвае да сябе людзей...**

— Тут вось што цікава: усё больш людзей з'язджаюць з Масквы. Не за мяжу, а ў іншыя гарады Расіі. З'язджаюць у першую чаргу адукаваныя, культурныя, таленавітыя, прадпрымальныя людзі. А на іх месца злятаецца розная шушамець. І там усе, пачынаючы ад паркоўшчыкаў і канчаючы высокімі чыноўнікамі, імкнуцца адзін аднаго падмануць. Усюды, на ўсіх узроўнях і этапах! І пры гэтым яны самі пра гэта гавораць! На кожным кроку крычаць аб праблемах ЖКГ, хабарах, чыноўніках, паліцыі, Думе. А ў паліклініку між тым без купюры і савацца не варта...

**— Дык ці будзеш вяртацца ў Мінск?**

— Я падпісаў кантракт з тэатрам на бліжэйшы год. І ў Мінск, калі шчыра, на радзіму мяне не цягне. Радзіма — гэта тое месца, дзе цябе шануюць, дзе ты запатрабаваны, дзе можаш рэалізаваць сябе. У Мінску, на жаль, такіх умоў для мяне няма. І нічога, акрамя чыстага паветра і сяброў, мяне сюды не цягне.

**Дзмітрый ПАДБЯРЭЗСКІ.**

МАЗАІКА

## *Віталь РАДЗІВОНАЎ:*
## *«У якім свеце паўстала наша краіна ў вачах каталонцаў?»*

*Траўміраваны форвард барысаўскага футбольнага клуба БАТЭ Віталь Радзівонаў падзяліўся ўражаннямі ад пройгрышу сваіх партнёраў "Барселоне" ў другім туры групавога этапу Лігі чэмпіёнаў.*



"Мы занадта пачціва паставіліся да саперніка, — цытуе словы футбаліста pressball.by. — Пры тым, што нам супрацьстаяў, як многія кажуць, адзін з мацнейшых клубаў свету. Я ўпэўнены, што барысаўчане маглі выступіць лепш. Маё глыбокае перакананне: БАТЭ цалкам не рэалізаваў патэнцыял. Асабліва гэта адносіцца да першага тайма. Калі я кажу пра залішнюю павагу да "Барселоны", маю на ўвазе не толькі футбалістаў. Непрыемна ўразіў антураж у аэрапорце, што спадарожнічаў прылёту іспанцаў. Гэта шчыльнае ачапленне амапаўцаў... З аднаго боку — захаванне мер бяспекі. А з іншага — у якім свеце паўстала наша краіна ў вачах каталонскай дэлегацыі? На мой погляд, гэта была не тая сітуацыя, калі варта звяртацца да такіх мер. Блакіраваць дзяцей, падлеткаў, якія дзве гадзіны чакалі з'яўлення куміраў... Тыя ж беларускія мытнікі з ветлівымі выразамі твараў з задавальненнем бяруць аўтографы ў заезджых зорак. Мытнікі, якіх я, як правіла, прывык бачыць панурымі і грубаватымі, якія становяцца ўсмешлівымі ў вельмі рэдкіх выпадках. Калі гэта, напрыклад, датычыцца асабістага знаёмства".

## *10 сутак за хвіліну славы*

*Суд Ленінскага раёна Мінска асудзіў балельшчыка, які выбег на поле мінскага стадыёна "Дынама" падчас матча "БАТЭ" — "Барселона", да 10 сутак адміністрацыйнага арышту, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама.*



У дачыненні да 25-гадовага рабочага мінскага прадпрыемства, вадзіцеля пагрузчыка, быў складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні, прадугледжаным артыкулам 17.1 КоАП (дробнае хуліганства). У крыві правапарушальніка было выяўлена 0,6—0,7 праміле алкаголю. Мяркуецца, што загараджальны бар'ер на стадыёне яму ўдалося пераадолець у месцы знаходжання інвалідаў-калясачнікаў на ўзвышшы.

Свае дзеянні балельшчык патлумачыў незадаволенасцю гульнёй, лікам на табло і жаданнем дапамагчы беларускай камандзе выйграць.

## *Пачынаем з нуля*

*У адборачным турніры чэмпіянату свету-2014 футбольная зборная Беларусі стартуе выязным матчам з Грузіяй. Гэта стала вядома пасля завяршэння праведзенай у Парыжы нарады галоўных трэнераў каманд групы I.*

Паводле інфармацыі прэс-службы Беларускай федэрацыі футбола, увесь каляндар выглядае наступным чынам:

**2012 год**

**7 верасня**. Грузія—БЕЛАРУСЬ, Фінляндыя—Францыя. **11 верасня**. Францыя—БЕЛАРУСЬ, Грузія—Іспанія. **12 кастрычніка**. БЕЛАРУСЬ—Іспанія, Фінляндыя—Грузія. **16 кастрычніка**. Іспанія—Францыя, БЕЛАРУСЬ—Грузія.

**2013 год**

**22 сакавіка.** Францыя—Грузія, Іспанія—Фінляндыя. **26 сакавіка**. Францыя—Іспанія. **7 чэрвеня**. Фінляндыя—БЕЛАРУСЬ. **11 чэрвеня**. БЕЛАРУСЬ—Фінляндыя. **6 верасня**. Грузія—Францыя, Фінляндыя—Іспанія. **10 верасня**. БЕЛАРУСЬ—Францыя, Грузія—Фінляндыя. **11 кастрычніка**. Іспанія—БЕЛАРУСЬ. **15 кастрычніка**. Іспанія—Грузія, Францыя—Фінляндыя.

Адборачны турнір у Еўропе пройдзе з 7 верасня 2012 года па 15 кастрычніка 2013 года. Матчы плэй-оф для васьмі найлепшых каманд сярод заняўшых другія месцы запланаваны на 15 і 19 лістапада 2013 года. Чэмпіянат свету 2014 года пройдзе ў Бразіліі з 12 чэрвеня па 13 ліпеня.

## *Дакаціліся да Малдовы*

*Зборная Малдовы стала сапернікам беларускіх тэнісістаў у першым крузе другой групы Еўра-Афрыканскай зоны Кубка Дэвіса-2012.*



*Матч пройдзе ў Мінску 10—12 лютага, паведаміў сайт турніру па выніках праведзенай у Бангкоку жараб'ёўкі.*

Пераможца і той, хто прайграў, 6—8 красавіка сустрэнуцца адпаведна з лепшай і горшай камандай у пары Турцыя — Боснія і Герцагавіна.

У рэйтынгу Кубка Дэвіса Беларусь займае 51-е месца, Малдова — 77-е.

У гэтым сезоне беларуская зборная спачатку выйграла дома ў балгараў (4:1), а затым прайграла ў гасцях венграм (2:3) і не выйшла ў вырашальны раунд, дзе былі разыграны пуцёўкі ў першую групу ЕАЗ, адкуль яна выбыла ў 2010 годзе, паведамляе БелаПАН.

**Аляксандр НІКАНОРАЎ.**

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

## *Леонид БРАЗИНСКИЙ:*
# «Женщины гораздо ответственнее мужчин»

*Месяц назад главным тренером женской сборной Беларуси по гандболу был назначен Леонид БРАЗИНСКИЙ. Леонид Иванович рассказал "Народной "Воле", легко ли работается с женщинами, есть ли сегодня слабые соперники, и почему он против натурализации зарубежных спортсменов.*

**— Прошел месяц после того, как вас поставили у руля сборной. Уже осмотрелись?**

— У меня есть хороший помощник Константин Шароваров (в свое время тоже возглавлял женскую национальную команду. — **Авт**.), который прекрасно знает всю эту кухню. Да и я видел всех, кто играет в белорусском чемпионате. Спортсменок, которые выступают в зарубежных клубах, правда, не просматривал, но, думаю, они на уровне.

**— Сборная стартует в отборочном турнире к чемпионату Европы-2012 уже в октябре, нам достались сложные соперницы — гандболистки Германии, Венгрии и Азербайджана…**

— А сейчас нет слабых групп и слабых соперниц. Это у нас вошло в практику на протяжении последних лет говорить: "Мы попали в сложную группу". Может быть, двадцать лет назад и можно было на пальцах пересчитать, кто у нас выиграет. А сейчас можно на тех же пальцах пересчитать, у кого мы способны выиграть. И такая ситуация не только в гандболе. Игровые виды спорта во всем мире развиваются, сражаться со всеми тяжело. И любая группа всегда будет сложная, хотя это не означает, что с ними не надо играть. О слабых соперниках пора забыть.

**— Леонид Иванович, до этого вы никогда не работали с женскими коллективами. Тяжело?**

— Не думаю, что с женщинами сложнее работать, чем с мужчинами. Но я знаю, как они работают. И, на мой взгляд, к делу женщины относятся гораздо ответственнее мужчин. Как и в жизни. Они и детей рожают, и воспитывают их, и хозяйство ведут. Работяги!

**— На гандболиста можно в случае чего и крепким словом прикрикнуть, а здесь, наверное, нужен более тонкий подход?**

— Я считаю, что и на мужика не стоит кричать, если тренеру есть что сказать и что объяснить. Неужели кто-то думает, что люди



станут лучше делать работу после крика? Глупости! Тем более в сборной — все солидные люди, профессионалы. Нет времени на крики и раскачки. Игроки прибывают на матчи на три-четыре дня, и за это время надо, наоборот, сплотить коллектив.

**— Сейчас вы совмещаете должность главного тренера в национальной команде с постом главного тренера в клубе "Машека". Не сложно?**

— В клубе у меня тоже есть хороший помощник, так что справляюсь.

**— Ваш предшественник Анатолий Закладный, как говорят, оставил след в истории белорусского женского гандбола. Сообщалось, что именно при нем было анекдотичное ЧП из майского турне по Украине и России. Проиграв в Киеве 19 мячей, белорусские тренеры уговорили украинских коллег официально представить для СМИ другой счет, сократив отрыв на десяток голов…**

— Понимаете, я в этих вещах человек тактичный, так что оценку тренеру давать не буду и не хочу. Хотя, конечно, жаль, что именно в период его руководства командой мы потеряли хорошего игрока. Вика Жилинскайте уехала в Россию.

**— Когда отправили в отставку Константина Шароварова, многие называли это ошибкой. Как вы считаете?**

— А я и до сих пор так считаю. Там было какое-то недоразумение, но я, когда подписывал контракт, восстановил статус-кво — вернул



Шароварова в сборную. Я не скажу, что федерация его выгнала в свое время с работы, но трения, обиды и недомолвки были. И Константин тогда сам написал заявление об уходе, а на его место назначили Закладного. А сейчас, думаю, все вернется на круги своя. Результат работы надо измерять не тем, кто занимает какие места, а тем, что сделано для того, чтобы в будущем был хороший результат. Надо улучшать чемпионат, подготовку... Есть масса вопросов, которые надо решать. Вот мы сейчас встречаемся с сильными сборными Германии и Венгрии. Но, может, это и к лучшему. Уроки — они еще никому не помешали.

**— А не думали пойти по тому пути, который избрали в футболе и хоккее, — натурализации зарубежных игроков с принятием белорусского гражданства и дальнейшим выступлением за национальную сборную нашей страны. Зачем своих растить? Многие проблемы сразу решаются!**

— Я к таким вещам всегда относился негативно. Дадут зарубежному спортсмену гражданство, будет он выступать за сборную... Но ведь не факт, что он усилит команду настолько, что сразу посыплется манна небесная и результаты. Гарантии этого не даст никто. Да, в клубе иностранный игрок — это обычная практика. Но сборная — совсем другое дело. Белорусский гандболист Сергей Рутенко — один из лучших в мире, имеет испанское гражданство. Но в сборную Испании его не берут. И не потому, что он слабый игрок, а потому, что в команде Испании играют только испанцы. Я тоже считаю, что за свою страну должны играть граждане этой страны. Так было бы более этично.

**Алесь СИВЫЙ.**

ПО ПОВОДУ



# В одни ворота...

*БАТЭ — "Барселона". Не передать словами, как ждали все любители футбола этот матч! "Барса" прибыла к нам впервые и показала, как надо играть. И, как мне кажется, за этот мастер-класс мы должны их благодарить.*

Сразу же хочу оговориться, что поражение с крупным счетом — 0:5 не поколебало моего уважения к белорусскому чемпиону, хотя некоторое время матч напоминал игру в одни ворота. Если хотите — в кошки-мышки. Извините за такое сравнение, но факт остается фактом.

Но вот что хотелось бы отметить. Воевать против испанцев можно и нужно было только их же оружием — умением держать мяч, тотальным прессингом, быстрыми переходами от обороны в нападение, неожиданными ударами по воротам из самых невероятных положений. Думаю, в таких матчах нужно играть в открытый футбол. Авантюра? А почему бы и не рискнуть? И не важно, сколько бы нам забили. Важно, сколько забили бы мы. Нужно было показать болельщикам и гостям, что хотя наш уровень и ниже, но мы готовы лечь костьми на этом поле. А борисовчане выглядели просто подавленными. Возможно, они проиграли этот матч задолго до его начала. Проиграли не на поле, а в своей голове.

Игра красноречиво показала всем нам, какая большая разница (особенно в индивидуальном мастерстве и разумных командных действиях) между нашим чемпионом и испанским. Впрочем, есть над чем работать не только БАТЭ. Пусть это поражение послужит серьезным уроком всем белорусским футболистам, руководителям клубов и федерации.

Но главное — ни в коем случае нельзя опускать руки. Как говорят: за одного битого дают двух небитых. Нужно сделать правильный вывод, памятуя, что мастерство никто нам на блюдечке с золотой каемочкой не принесет. Его можно повышать только колоссальным трудом.

**Юрий ЯСИНСКИЙ,**
**ветеран спорта,**
**заслуженный**
**тренер БССР.**

ШАХМАТЫ

## Задача-лауреат
## *В.Алайков*

**Белые:** Kph2, Фа5, Лd3, Ле2, Cd7, Ch4, Kg4, Kg7, пп. e4, g5 (10).

**Черные:** Kpf4, Cb5, Cc3, Ka2, пп. a6, b6, g6 (7).

**Мат в 2 хода.**



Предлагаем вниманию читателей двухходовую задачу известного болгарского мастера Венелина Алайкова. В.Алайков составил свыше 900 задач разных жанров, завоевал около 150 призов, в том числе более 60 первых. Свои решения присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная Воля", "Шахматы".**

## *Из копилки миниатюр*
## Атакует Виктор Купрейчик

Следующая партия была сыграна на чемпионате Европы по шахматам среди ветеранов, проходившем в этом году в Италии. Нашу страну представлял международный гроссмейстер Виктор Купрейчик. В партии с израильским гроссмейстером, бывшим ленинградцем, Марком Цейтлином, Купрейчик провел эффектную атаку с многочисленными жертвами и разгромил позицию соперника.

## *В.Купрейчик — М.Цейтлин*
## Сицилианская защита

1.e4 c5 2.Ke2 d6 3.d4 cd 4.K:d4 Kf6 5.Kc3 a6 6.Cg5 Kbd7 7.f4 Фc7 8.Фe2 g6 9.o-o-o Cg7 10.Kpb1 o-o 11.f5 b5 12.h4 Kb6 13.h5 K:h5 14.Л:h5! gh 15.Ф:h5 e5 16.f6 ed 17.Cd3! Грозит 18.e5. 17. ...Ле8 18.e5 h6 19.C:h6 Л:e5 20.Ch7+! Kp:h7 21.Cg5+, и черные сдались. На 21... Kpg8 решает 22.fg.

## Юбилей великого чемпиона

В августе отмечалось 100-летие со дня рождения пятикратного чемпиона мира, патриарха советской шахматной школы Михаила Ботвинника. В честь юбилея в Санкт-Петербурге, городе, в котором начинал свою шахматную карьеру великий шахматист, прошел международный шахматный турнир, имевший также статус этапа Кубка России.

В турнире, проводившемся по швейцарской системе в 9 туров, приняли участие свыше 100 спортсменов. В напряженной борьбе к финишу вместе пришли сразу 7 участников, набравшие по 7 очков из 9 возможных. По дополнительным критериям победителем турнира был признан российский гроссмейстер Денис Хисматулин. Успеха добился минчанин гроссмейстер Алексей Александров, завоевавший второй приз.

Следует отметить успешное выступление молодого минского студента, мастера ФИДЕ Дмитрия Буланова. Он набрал 6 очков и финишировал на 25-м месте.

ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ

## *Здароўя, Арвідас Сабоніс!*

*Легендарны літоўскі баскетбаліст Арвідас Сабоніс на мінулым тыдні перанёс інфаркт міякарда.*



Зрэшты, стала вядома, што 46-гадовы Арвідас Сабоніс, які аднаўляецца пасля інфаркту, ужо выпісаны з бальніцы.

Літоўскія медыкі сцвярджаюць, што стан здароўя легендарнага баскетбаліста вельмі добры, і ўжо думаюць аб рэабілітацыі. Сабоніс, які пакуль адмаўляецца мець зносіны са СМІ, пасля інфаркту быў пераведзены ў асобную аднамесную палату.

"Я лічу, што зараз стан яго здароўя вельмі добры. Але ён сур'ёзны пацыент, і яму неабходны спакой. Мы радуемся вынікам, і спадзяёмся, што ўсё будзе добра", — сказаў кіраўнік кардыялагічнай клінікі прафесар Рэмігіюс Жалюнас

## *Спакой ім толькі сніўся...*

*Амерыканскі баксёр Дзьюі Базела, які 26 гадоў правёў у турме, будзе дэбютаваць на прафесійным рынгу.*

52-гадовы Базела правядзе паядынак 15 снежня ў Лос-Анджэлесе. З-за ўзросту і адсутнасці вопыту яму давядзецца прайсці шэраг тэстаў, але баксёр ужо атрымаў ліцэнзію ад Атлетычнай камісіі штата Каліфорнія. Аб гэтым паведамляе ESPN.

Матч з удзелам Базелы адбудзецца ў рамках баксёрскага шоу, галоўнай падзеяй якога і стане бой чэмпіёна свету па версіі WBC (Сусветны баксёрскі савет) у вазе да 79,4 кг амерыканца Бернарда Хопкінса з суайчыннікам Чэдам Доўсанам.

Базела правядзе паядынак у вазе да 90,9 кг. Сапернік 52-гадовага баксёра пакуль не вызначыўся.

У маладосці Базела быў баксёрам-аматарам. У 1983 годзе спартсмен быў прызнаны вінаватым у забойстве 92-гадовай жанчыны. Базела шмат гадоў імкнуўся даказаць, што прысуд вынесены памылкова, а доказаў яго віны не існуе. І ў 2009 годзе спартсмену гэта ўдалося, пасля чаго той выйшаў з турмы на свабоду.

Як піша выданне USA Today, у перыяд заключэння ў турме Сінг-Сінг Базела стаў чэмпіёнам свету па боксу сярод асуджаных, пры гэтым спартсмен ні разу не прайграў. У турме баксёр таксама атрымаў вышэйшую адукацыю і, як адзначае выданне, лічыўся ўзорным асуджаным.

## *Дарагі наш «Манчэстэр»*

*Футбольны клуб "Манчэстэр Юнайтэд" стаў самым дарагім спартыўным брэндам у свеце. Аб гэтым паведамляе Marketing Week са спасылкай на даследаванне, якое праводзіла агенцтва Brand Finance.*



Згодна з даследаваннем, кошт брэнда "Манчэстэр Юнайтэд" з 2005-га па 2011 год вырас на 109 працэнтаў і дасягнуў 412 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. Brand Finance звязвае такі рост з паспяховай палітыкай яго ўладальнікаў — сям'і Глэйзер.

У 2011 годзе гадавы прыбытак клуба склаў рэкордную суму ў 110 мільёнаў фунтаў. У клуба заключаны больш за 20 кантрактаў з сусветна вядомымі брэндамі, сярод якіх Nike, Aon, Audi и DHL.

У гэтым годзе ўладальнікі клуба маюць намер правесці пярвічнае размяшчэнне акцый (IPO) "Манчэстэр Юнайтэд" на сінгапурскай біржы. Па звестках Brand Finance, кошт брэнда "Манчэстэр Юнайтэд" складае 20 працэнтаў ад кошту клуба, якія заяўлены для IPO (2 мільярды фунтаў стэрлінгаў).

Як паведамляла The Sunday Mirror, на сінгапурскай біржы сям'я Глэйзераў збіраецца прадаць 25 працэнтаў акцый клуба. Яны маюць намер пусціць атрыманыя грошы на выплату пазык клуба, якія ў гэтым годзе дасягнулі 308 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў.

Пасля перамогі ў чэмпіянаце Англіі ў сезоне 2010—2011 года "Манчэстэр Юнайтэд" быў прызнаны самым паспяховым англійскім клубам. "Манчэстэр Юнайтэд" стаў 19-разовым чэмпіёнам Англіі і, такім чынам, абышоў "Ліверпуль", які на працягу працяглага часу захоўваў статус самага тытулаванага клуба англійскай прэм'ер-лігі.

**Алесь СВЯТЛАНІЧ.**

**Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а. Прыёмная: тэл. (017) 3286871. Тэл./факс рэкламнага аддзела: (017) 3286904, 3286906 nv@promedia.by**
**http://www.nv-online.info http://twitter.com/narodnaya_volya**

ISSN 2071-9647

**Падпісныя індэксы: 63222, 632222**

**Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ**

**У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 3.10.2011 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 27020 экз. Заказ №4755.**